Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
.2022

**МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ**
**ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
**“БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА”**
**спецыяльнасці перападрыхтоўкі**
**2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія**

Мінск, 2022

Складальнік:
*Прадзеіна А.В., дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін*

*(пратакол ад 07.09.2022 № 36);*

*Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў*

*(пратакол ад 22.09.2022 № 8 ).*

# ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| 1 | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………….......... | 4 |
| 2 | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………….......... | 6 |
| | Канспект лекцый……………………………………………………....... | 6 |
| 3 | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ………………………………………….. | 36 |
| | Матэрыялы для правядзення круглых сталоў, дзелавых гульняў…. | 36 |
| 4 | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………………………... | 39 |
| 4.1 | Пытанні для бягучай атэстацыі слухачоў ….……………….............. | 39 |
| 4.2 | Заданні для самастойнай работы………..…………………………... | 41 |
| 4.3 | Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў…………... | 51 |
| 5 | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………………… | 52 |
| 5.1 | Вучэбная праграма………………………………………………………. | 52 |
| 5.2 | Асноўная літаратура………..……………………………..……… | 81 |
| 5.3 | Дадатковая літаратура…………………………………………………... | 81 |

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прадстаўленыя метадычныя рэкамендацыі па дысцыпліне “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” прадугледжваюць рэалізацыю патрабаванняў, якія ўстаноўлены Адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 2-23 02 71 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.09.2020 № 259.

Для вывучэння дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” прадугледжана 30 вучэбных гадзін, якія ўключаюць 14 вучэбных гадзін аўдыторных заняткаў (у тым ліку: 6 вучэбных гадзін лекцый, 2 вучэбныя гадзіны – круглы стал, 2 вучэбныя гадзіны – дзелавых гульняў); 16 вучэбных гадзін самастойнай работы.

Дысцыпліна “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” адносіцца да кампанента тыпавога вучэбнага плана “Агульнапрафесійныя дысцыпліны” і вывучаецца ва ўзаемасувязі з дысцыплінамі “Дакументазнаўства”, “Бібліяграфазнаўства”, “Бібліятэказнаўства”, “Бібліятэчны фонд”, “Каталагізацыя дакументаў”, “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы”, “Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў”, “Асновы інфармацыйных тэхналогій”.

**Мэта метадычных рэкамендацый:** садзейнічанне засваенню: тэарэтычных асноў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства**;** паняцця, зместу і спецыфікі ажыццяўлення краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, як у традыцыйным, так і электронным асяроддзі.

**Задачы метадычных рэкамендацый**:

засваенне слухачамі тэарэтычных пытанняў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

разгляд арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

раскрыццё асаблівасцей ажыццяўлення дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве.

**Метады навучання**: традыцыйныя (метады арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады стымуліравання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады кантроля і самакантроля); актыўныя; інтэрактыўныя.

**Сродкі навучання**: аўдыяльныя, візуальныя, аўдыявізуальныя.

**Формы вучэбных заняткаў:** лекцыі, круглыя сталы, дзелавыя гульні, трэнінг.

**Форма атрымання адукацыі:** завочная.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў.**

У выніку засваення дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” ў слухача павінны быць сфарміраваны сацыяльна-асобасныя, акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі.

*Патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць ідэалогію беларускай дзяржавы, маральныя і прававыя нормы, умець улічваць іх у сваёй прафесійнай дзейнасці;

умець арыентавацца ў працэсах і тэндэнцыях развіцця сучаснага грамадства.

*Патрабаванні да фармавання акадэмічных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць асаблівасці функцыянавання ў грамадстве дакументаў як носьбітаў сацыяльнай інфармацыі;

ведаць базавыя тэарэтычныя веды ў галіне дакументазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, умець прымяняць іх для вырашэння практычных і навуковых задач бібліятэчнай сферы

ведаць тэарэтычныя асновы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

ведаць спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці па краязнаўстве.

*Патрабаванні да фармавання прафесійных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць змест, формы арганізацыі, задачы краязнаўства як грамадскай з’явы;

ведаць паняцце, мэту, задачы краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

ведаць асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству;

ведаць групы карыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці ў краязнаўчай інфаомацыі;

ведаць віды крыніц краязнаўчай інфармацыі;

ведаць інфармацыйныя рэсурсы па краязнаўству, тэхналогію іх фарміравання;

ведаць віды бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству, тэхналогію іх рэалізацыі;

ведаць формы, напрамкі навукова-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк па краязнаўству;

ведаць краязнаўчы аспект матэрыяльна-тэхнічнай базы дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству;

ведаць краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства.

умець фарміраваць і выкарыстоўваць фонды краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэк;

умець падрыхтоўваць краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты, рэсурсы;

умець рэалізоўваць усе віды бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству;

умець рэалізоўваць навукова-метадычную і навукова-даследчую дзейнасць бібліятэкі па краязнаўству.

**Форма бягучай атэстацыі – залік.**

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Канспект лекцый

### Раздзел 1 Асновы тэорыі і арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі

#### Тэма 1.1 Краязнаўства як грамадская з’ява

Існуюць наступныя *формы арганізацыі краязнаўства*: дзяржаўная, грамадская, школьная, кааператыўна-камерцыйная, асобна-ініцыятыўная.

*Дзяржаўнае* краязнаўства гэта вывучэнне края мясцовымі гаспадарнымі органамі, вывучэнне края дзяржаўнымі ўстановамі. Іх функцыі: збіраць, вывучаць і папулярызаваць гістарычныя помнікі, творы мастацтва; ствараць экспазіцыі, якія прысвечаны прыродным каштоўнасцям і эканоміцы края; ствараць каталогі, даведнікі, пуцевадзіцелі, тэматычныя зборнікі навуковых прац. Мясцовыя выдавецтвы, абласныя кнігагандлі і кніжныя магазіны спрыяюць распаўсюджванню і папулярызацыі краязнаўчай літаратуры.

*Грамадскае* краязнаўства развіваецца па ініцыятыве аматараў краязнаўства. На сучасным этапе ствараецца многа краязнаўчых грамадскіх арганізацый, якія зарэгістраваны ў розных установах (музеях, бібліятэках, дамах культуры і інш.)

У межах *школьнага* краязнаўства вучні розных класаў вывучаюць свой край у час вучэбных заняткаў, у гуртках і школьных музеях, на экскурсіях, у турысцкіх паходах. Сустракаюцца з мясцовымі краязнаўцамі, удзельнічаюць у вечарынах, конкурсах, алімпіядах па краязнаўстве. Акрамя таго, краязнаўчы матэрыял займае асаблівае месца ў выкладанні шэрагу дысцыплін: гісторыі, геаграфіі, літаратуры.

У Рэспубліцы Беларусь у 2021 годзе зацверджана “Палажэнне аб краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь (Мінск, 2021). У Расійскай Федэрацыі распрацаваны “Руководство по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018), “Руководство по краеведческой деятельности центральной библиотеки субъекта РФ» (Красноярск, 2017).

Краязнаўчая бібліятэчная дзейнасць (далей – КБД) – прафесійная дзейнасць, накіраваная на задавальненне патрэб грамадства ў краязнаўчай інфармацыі сродкамі бібліятэк.

Мэтай краязнаўчай і радзімазнаўчай дзейнасці бібліятэк з’яўляецца садзейнічанне:

– сацыяльнаму, эканамічнаму, культурнаму развіццю краю;
– адраджэнню і захаванню гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны;

– усебаковаму навуковаму даследаванню краю;
– папулярызацыі ведаў аб краі;
– патрыятычнаму выхаванню.

Задачамі бібліятэк у сферы краязнаўства з’яўляюцца:

– пошук і выяўленне краязнаўчых і мясцовых дакументаў пэўнай тэрыторыі, іх збор і захаванне;

– адлюстраванне звестак аб мясцовых і краязнаўчых дакументах у нфармацыйна-пошукавых сістэмах (незалежна ад месца захоўвання дакументаў);

– інфармаванне аб краязнаўчых дакументах і абслугоўванне імі карыстальнікаў сваёй і іншых бібліятэк;

– фарміраванне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і забеспячэнне іх даступнасці ў рэгіёне і за яго межамі;

– распаўсюджванне і папулярызацыя краязнаўчых ведаў;

– фарміраванне і развіццё краязнаўчых інфармацыйных патрэб.

У адпаведнасци з “Руководством по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018) усе публічныя бібліятэкі (далей – ПБ) падпарадкоўваюцца агульным мэтам краязнаўчай дзейнасці бібліятэк і агульным патрабаванням да якасці яе вынікаў (рэсурсаў, прадуктаў і паслуг). Адрозненні паміж бібліятэкамі выяўляюцца ў складзе задач і асобных аспектах арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. З гэтага пункту гледжання ўсе публічныя бібліятэкі дзеляцца на дзве катэгорыі, якія вызначаюцца толькі па адміністратыўнаму статусу зоны абслугоўвання (тэрыторыі), незалежна ад формы ўласнасці (дзяржаўная, муніцыпальная), маштабаў тэрыторыі (плошчы, колькасці насельніцтва, колькасці населеных пунктаў і інш.) і структуры (наяўнасці або адсутнасці ўласнай сеткі).

Аснову краязнаўчай дзейнасці ПБ складаюць яе краязнаўчыя рэсурсы, якія ўключаюць краязнаўчыя фонды і базавыя элементы краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата.

У КБД ПБ вылучаюцца два асноўныя напрамкі:

- праца з дакументамі, звязанымі з тэрыторыяй зместам (краязнаўчымі дакументамі);

- праца з выданнямі, звязанымі з тэрыторыяй паходжаннем (мясцовымі выданнямі).

Усе ПБ працуюць з краязнаўчымі дакументамі; пры гэтым для іх у роўнай ступені важныя пярвічныя крыніцы краязнаўчай інфармацыі (неапублікаваныя дакументы) і другасныя – апублікаваныя.

Цэнтральныя ПБ працуюць таксама з мясцовымі выданьнямі. Пад мясцовымі выданнямі ў дачыненні да ПБ разумеюцца выданні, якія выйшлі ў свет на тэрыторыі, якая абслугоўваецца дадзенай цэнтральнай ПБ або па замове мясцовых устаноў – за яе межамі. Па гэтым кірунку цэнтральныя ПБ, як правіла, удзельнічаюць у карпаратыўных праектах па стварэнні бібліяграфічных рэпертуараў, зводных каталогаў і электронных калекцый

мясцовых выданняў рэгіёна, якія арганізуюцца цэнтральнай бібліятэкай рэгіёна; могуць весці і ўласныя праекты, калі тэрыторыя характарызуецца актыўнай выдавецкай дзейнасцю ў мінулым ці сучаснасці.

Мясцовая ПБ – асноўны і самы масавы суб'ект у сістэме КБД, які забяспечвае збор, захаванне і ўвядзенне ў грамадскі абарот першасных (унікальных) крыніц краязнаўчай інфармацыі і актыўна ўзаемадзейнічае з мясцовымі жыхарамі – носьбітамі і спажыўцамі краязнаўчай інфармацыі. Яна пастаянна ўзаемадзейнічае са сваёй цэнтральнай ПБ і пры неабходнасці – з цэнтральнай бібліятэкай рэгіёну.

У рамках краязнаўчай дзейнасці мясцовая ПБ выконвае наступныя віды работ па сваёй тэрыторыі:

- збірае і ўключае ў фонд краязнаўчыя выданні;
- збірае, апрацоўвае і захоўвае неапублікаваныя краязнаўчыя дакументы;
- ажыццяўляе экспертны адбор сеткавых краязнаўчых дакументаў для ўключэння ў свой электронны краязнаўчы архіў;
- збірае, апрацоўвае і захоўвае фактаграфічную інфармацыю, удзельнічаючы ў фарміраванні універсальнай фактаграфічнай краязнаўчай базы даных (далей – УФКБД);
- стварае краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты;
- прадастаўляе краязнаўчыя дакументы наведвальнікам бібліятэкі і аддаленым карыстальнікам;
- ажыццяўляе бібліяграфічнае абслугоўванне наведвальнікаў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў у адпаведнасці з краязнаўчымі бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі запытамі;
- забяспечвае прасоўванне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, прадуктаў і паслуг даступнымі сродкамі.

### Тэма 1.2 Асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству

З мэтай забеспячэння асноўных напрамкаў краязнаўчай дзейнасці ажыццяўляецца ўзаемадзеянне паміж бібліятэкамі рознага ўзроўню, розных сістэм і ведамстваў.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (далей – НББ) з’яўляецца метадычным і кансультацыйным цэнтрам для бібліятэк краіны па краязнаўчай рабоце.

Асноўныя напрамкі дзейнасці НББ у галіне беларусазнаўства і краязнаўства:

- фарміраванне фондаў нацыянальных дакументаў;
- выяўленне нацыянальных/краязнаўчых дакументаў, якія адсутнічаюць у фондах бібліятэкі, набыццё іх арыгіналаў або электронных копій;

- стварэнне лакальных і зводных электронных інфармацыйных рэсурсаў (далей – ЭІР), якія з'яўляюцца крыніцамі беларусазнаўчай і краязнаўчай інфармацыі;

- удзел у стварэнні рэгіянальных паўнатэкставых рэсурсаў (выяўленне краязнаўчых дакументаў, іх алічбоўка);

- арганізацыя аддаленага доступу да краязнаўчай інфармацыі;

- каардынацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк краіны;

- аналіз стану краязнаўчай работы рэгіянальных бібліятэк, метадычнае, навукова-практычнае забеспячэнне па пытаннях краязнаўства, распрацоўка рэгламентуючых дакументаў;

- навукова-даследчая дзейнасць у галіне краязнаўства, ажыццяўленне навуковых праектаў па тэмах, звязаных з краязнаўствам;

- стварэнне выдавецкай прадукцыі краіназнаўчай і краязнаўчай тэматыкі;

- арганізацыя і правядзенне навукова-практычных, вытворчых, сацыякультурных мерапрыемстваў;

- удзел у павышэнні кваліфікацыі кадраў, у тым ліку па пытаннях бібліятэчнага краязнаўства.

Абласныя бібліятэкі з'яўляюцца цэнтрамі краязнаўчай дзейнасці ў рэгёнах.

Краязнаўчая работа вядзецца ўсімі аддзеламі абласной бібліятэкі пад агульным кіраўніцтвам дырэктара ці яго намеснікаў. Цэнтрам краязнаўчай работы з'яўляецца спецыялізаванае структурнае падраздзяленне (аддзел краязнаўства/краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ці сектар у складзе інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела).

У галіне бібліятэчнага краязнаўства абласная бібліятэка выконвае функцыі:

- галоўнага сховішча краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў вобласці (імкнецца да якаснага фарміравання фондаў, якія павінны задавальняць разнастайныя інфармацыйныя патрэбы насельніцтва рэгіёна, у тым ліку ў краязнаўчай інфармацыі, гэтым самым прымае ўдзел у фарміраванні і захаванні сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду);

- установы, якая здзяйсняе бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне краязнаўчай інфармацыяй (прадастаўляе доступ як да саміх краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, так і да бібліяграфічнай і аўтарытэтнай інфармацыі аб іх; ажыццяўляе бібліяграфічнае абслугоўванне па запытах краязнаўчага характару і кансультацыйную дапамогу ў выкарыстанні крыніц краязнаўчай інфармацыі);

- рэгіянальнага бібліяграфічнага цэнтра (удзельнічае ў стварэнні рэсурсаў нацыянальнай і краязнаўчай бібліяграфіі);

- метадычнага і каардынацыйнага цэнтра (фарміруе агульную стратэгію краязнаўчай дзейнасці бібліятэк вобласці, арганізуе, каардынуе і метадычна забяспечвае гэту дзейнасць);

- навуковай установы (арганізуе і праводзіць даследаванні ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства);

- удзельніка грамадскага краязнаўчага руху (узаемадзейнічае з краязнаўчымі аб'яднаннямі: таварыствамі, клубамі, краязнаўчымі музеямі, а таксама з асобнымі краязнаўцамі).

Цэнтральная бібліятэка раённай (гарадской) ЦБС узначальвае і вядзе краязнаўчую дзейнасць у межах свайго раёна, бібліятэкі-філіялы збіраюць і прадастаўляюць карыстальнікам матэрыялы пра тэрыторыі, якія яны абслугоўваюць.

Бібліятэкі асобных арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў збіраюць і ствараюць інфармацыю, звязаную з дзейнасцю гэтых арганізацый.

У адпаведнасці з "Руководством по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ" (Владимир, 2018) у цэнтральнай ПБ краязнаўчая праца вядзецца ўсімі аддзеламі пад агульным кіраўніцтвам дырэктара бібліятэкі ці яго намесніка. Цэнтрам краязнаўчай работы з'яўляецца спецыялізаванае падраздзяленне (аддзел або сектар краязнаўства); у невялікіх цэнтральных ПБ – спецыяліст, які адказвае за краязнаўчую дзейнасць. Гэта падраздзяленне (або спецыяліст) займаецца пераважна бібліяграфічнай работай (удзелам у бібліяграфічнай апрацоўцы краязнаўчых дакументаў, фарміраваннем КСБА, падрыхтоўкай краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў, бібліяграфічным абслугоўваннем).

Цэнтральная ПБ пастаянна ўзаемадзейнічае з цэнтральнай бібліятэкай рэгіёну па ўсіх напрамках КБД; абавязкова ўдзельнічае ў карпаратыўных праектах па бібліяграфічнай апрацоўцы краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў і фарміраванні электроннага краязнаўчага каталога і электроннага каталога мясцовых выданняў, даведачна-бібліяграфічнаму абслугоўванню, прасоўванню краязнаўчых рэсурсаў, прадуктаў і паслуг і г.д.

Узаемадзеянне з іншымі ПБ тэрыторыі абумоўліваецца становішчам цэнтральнай ПБ як каардынацыйнага і метадычнага цэнтра. Узаемадзеянне з бібліятэкамі іншых тыпаў і ведамстваў, а таксама іншымі ўстановамі тэрыторыі, будуецца на аснове добраахвотнасці і ўзаемнай зацікаўленасці ўдзельнікаў і афармляецца дагаворамі.

Цэнтральная ПБ арганізуе ўзаемадзеянне бібліятэк і іншых устаноў тэрыторыі ў галіне КБД па наступных асноўных напрамках:

- практычная дзейнасць па падрыхтоўцы краязнаўчых рэсурсаў і прадуктаў;

- выкананне складаных бібліяграфічных пошукаў краязнаўчага характару;

- практычная дзейнасць па правядзенні масавых краязнаўчых мерапрыемстваў;

- павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў у галіне КБД;

- даследаванні ў галіне КБД і краязнаўства.

Распаўсюджанай і эфектыўнай формай супрацоўніцтва з'яўляюцца

краязнаўчыя праекты рознага ўзроўню.

Распаўсюджванне краязнаўчых ведаў праводзіцца сістэматычна, адлюстроўваецца ў планах работы бібліятэк і ажыццяўляецца ў цеснай сувязі з грамадскімі, навуковымі, дзяржаўнымі арганізацыямі і ўстановамі, якія займаюцца краязнаўчай работай.

Бібліятэкі вядуць планамерную і мэтанакіраваную работу па распаўсюджванні і папулярызацыі ведаў аб мясцовасцях і населеных пунктах і фарміраванні патрэб у краязнаўчай інфармацыі. Гэта дзейнасць ажыццяўляецца па некалькіх асноўных накірунках:

арганізацыя і правядзенне экскурсій, прэзентацый, навуковых і сацыякультурных мерапрыемстваў, гуртковай, клубнай работы;

падрыхтоўка і публікацыя навуковых, даведачных, папулярных краязнаўчых матэрыялаў;

стварэнне разнастайных электронных інфармацыйных рэсурсаў краязнаўчай тэматыкі;

стварэнне камфортнага інфармацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае магчымасць самастойнага атрымання краязнаўчай інфармацыі ў аддаленым доступе;

стварэнне груп у сацыяльных сетках, дзякуючы якім краязнаўчая інфармацыя, вынікі краязнаўчай дзейнасці становяцца даступнымі больш шырокаму колу зацікаўленых карыстальнікаў.

Бібліятэчныя ўстановы праводзяць навуковыя канферэнцыі, семінары, краязнаўчыя чытанні, круглыя сталы (у тым ліку міжнародныя). Даклады, выстаўкі, экскурсіі, прэзентацыі, якія арганізоўваюцца ў час правядзення канферэнцый, павінны спрыяць раскрыццю бібліятэчных фондаў, распаўсюджванню вынікаў даследаванняў, вяртанню з небыцця імён, абуджэнню інтарэсу да мясцовай гісторыі.

Сярод сацыякультурных мерапрыемстваў краязнаўчага характару – выстаўкі-агляды краязнаўчай літаратуры, сустрэчы з краязнаўцамі і аўтарамі кніг, краязнаўчыя падарожжы (у тым ліку віртуальныя), экскурсы ў гісторыю краю, пазнавальныя вечары, віктарыны-ўспаміны, квэсты, эколага-краязнаўчыя гульні і інш.

Бібліятэкі самастойна або ў супрацоўніцтве з іншымі арганізацыямі рэалізуюць выдавецкія праекты (выпускаюць кнігі краязнаўчай тэматыкі, электронныя выданні, навуковыя зборнікі, матэрыялы навуковых канферэнцый і чытанняў, часопісы, газеты, хрэстаматыі, папулярныя энцыклапедыі, даведнікі, краязнаўчыя календары, хронікі, летапісы падзей, альманахі, фотаальбомы, камплекты паштовак і інш.).

Бібліятэкі супрацоўнічаюць са СМІ, публікуюць інфармацыю пра свае інфармацыйныя рэсурсы, паслугі, акцыі і мерапрыемствы краязнаўчага характару.

З мэтай папулярызацыі краязнаўчых ведаў бібліятэкі ствараюць музеі/музейныя куткі, выставы, літаратурныя, мемарыяльныя кабінеты і да т.п.

Краязнаўчую інфармацыю рэгіянальныя бібліятэкі прадстаўляюць у спецыялізаваных раздзелах (рубрыках) сайтаў/парталаў і прадастаўляюць свабодны доступ да яе. На бібліятэчных сайтах размяшчаюцца краязнаўчыя базы даных, электронныя калекцыі, віртуальныя выстаўкі, алічбаваныя выданні краязнаўчага зместу, выпускі календароў знамянальных і памятных дат, матэрыялы пра славутых землякоў і іншая карысная інфармацыя, звязаная з канкрэтным рэгіёнам.

Павышэнне даступнасці інфармацыі (у тым ліку краязнаўчай) на бібліятэчных сайтах дасягаецца шляхам стварэння і падтрымкі мабільных версій і мабільных дадаткаў; шматмоўных інтэрфейсаў; версій для людзей з абмежаванымі магчымасцямі па зроку і інш.

Прамоцыя крыніц краязнаўчай інфармацыі згодна з “Руководством по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018) прапаноўваецца наступная. ПБ вядзе планамерную і мэтанакіраваную работу па прамоцыі крыніц аб'ектыўнай і дакладнай краязнаўчай інфармацыі аб тэрыторыі, а таксама фарміраванні і развіцці патрэбнасцей у краязнаўчай інфармацыі. Гэта дзейнасць ажыццяўляецца па некалькіх асноўных напрамках:

- на краязнаўчым сайце або ў раздзеле сайта;
- у выдавецкай дзейнасці;
- у сацыяльных медыя і СМІ;
- у масавых мерапрыемствах.

Галоўны сродак прамоцыі краязнаўчай інфармацыі – краязнаўчы сайт або раздзел сайта. Ён выконвае функцыю інфармацыйнага партала сваёй тэрыторыі, прадстаўляючы яе ў віртуальнай прасторы, і служыць адзінай кропкай доступу да ўсіх крыніц надзейнай краязнаўчай інфармацыі пра яе. Яго мэтамі з'яўляюцца:

- стварэнне камфортнага інфармацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае магчымасць самастойнага атрымання краязнаўчай інфармацыі;
- прасоўванне краязнаўчых рэсурсаў, прадуктаў і паслуг усіх суб'ектаў краязнаўчай дзейнасці сваёй тэрыторыі (у першую чаргу – ПБ);
- метадычная падтрымка і забеспячэнне эфектыўнага ўзаемадзеяння суб'ектаў краязнаўчай дзейнасці на сваёй тэрыторыі;
- стварэнне ўмоў для ўдзелу карыстальнікаў у краязнаўчай дзейнасці (у тым ліку шляхам выкарыстання інтэрактыўных інтэрнэт-сэрвісаў).

Краязнаўчы сайт або раздзел сайта абавязкова вядзе цэнтральная ПБ і па магчымасці – мясцовыя ПБ.

На краязнаўчым сайце або ў раздзеле сайта размяшчаюцца:

- асноўныя краязнаўчыя БД (ЭКК, ЭКМІ, УФКБД);
- электронная краязнаўчая бібліятэка або асобныя электронныя

краязнаўчыя калекцыі;

- краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты, створаныя спецыяльна для сайта або адаптаваныя для яго;

- спасылкі на найбольш буйныя, карысныя і стабільныя краязнаўчыя рэсурсы, якія знаходзяцца на сайтах бібліятэк і іншых устаноў, асобных даследчыкаў і краязнаўцаў і інш.

- інфармацыя аб краязнаўчых рэсурсах (КСБА, фондах, калекцыях, рэдкіх і каштоўных дакументах і інш.), прадуктах і паслугах цэнтральнай ПБ і іншых бібліятэк тэрыторыі;

- віртуальная краязнаўчая даведачная служба.

Асновай краязнаўчага сайта або раздзела сайта з'яўляецца электронная краязнаўчая бібліятэка – збор электронных краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, спецыяльна адабраных па крытэрыях якасці (каштоўнасці, рэдкасці) і даступных на сайце цэнтральнай ПБ. Яна складаецца з віртуальных калекцый, што выдзяляюцца ў разліку на актыўны рэальны або прагназуемы карыстацкі попыт. У складзе электроннай краязнаўчай бібліятэкі выдзяляюцца калекцыі:

- па зместу (тэмах, прадметах, персонам);
- па відах дакументаў (газеты, часопісы, улёткі, эстампы, ноты і інш.);
- па мовах;
- па храналогіі;
- па аўтарах (індывідуальным і калектыўным);
- па месцах захоўвання (фондатрымальнікам);
- па крытэрыях асаблівай каштоўнасці (кніжныя рэдкасці, унікумы, раскошныя выданні, выданні з аўта-графамі і маргіналіямі, і т. д.);
- рэальных калекцыях, якія склаліся ў фондах цэнтральнай ПБ (атрыманыя ў дар або сфармаваныя самой бібліятэкай у ходзе яе краязнаўчай дзейнасці).

Электронная краязнаўчая калекцыя ўключае адкрытыя для грамадскага выкарыстання дакументы, якія ёсць у фондах дадзенай цэнтральнай ПБ або (па спасылцы) за яе межамі. Такая калекцыя мае простую (як правіла, двухузроўневую) унутраную структуру, якая забяспечвае выкарыстанне без звароту да ЭКК, анатаваныя бібліяграфічныя апісанні і ўступны тэкст.

Склад калекцый мяняецца: адны і тыя ж дакументы могуць быць прадстаўлены адначасова ў розных калекцыях. Абавязковым патрабаваннем да электроннай краязнаўчай бібліятэкі з'яўляецца наяўнасць уласных сродкаў навігацыі і пошуку канкрэтных выданняў і публікацый.

Усе краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы і прадукты, прадстаўленыя на сайце або ў раздзеле сайта, звязаны ўзаемнымі спасылкамі, якія забяспечваюць іх эфектыўнае прасоўванне і зручную навігацыю для карыстальнікаў.

Цэнтральная ПБ прадпрымае меры для павышэння даступнасці сайта або часткі сайта, для чаго стварае і падтрымлівае:

- мабільную версію і мабільныя прыкладанні;

- версію для людзей з абмежаванымі магчымасцямі па зроку (у адпаведнасці з патрабаваннямі фарміравання безбар'ернага асяроддзя);

- для бібліятэк, якія знаходзяцца ў рэспубліках і нацыянальных акругах;

- версію на мове (мовах) тытульнай нацыі сваёй рэспублікі або акругі.

Цэнтральная ПБ ажыццяўляе выдавецкую краязнаўчую дзейнасць (у папяровай і/або электроннай форме): падрыхтоўку і выданне навуковых, даведачных, папулярных краязнаўчых матэрыялаў (навуковых зборнікаў, краязнаўчых календароў, хронік, летапісаў падзей; даведнікаў; альмана-хаў, дайджэстаў лепшых тэкстаў і інш.). Самастойна або ў партнёрстве з выдавецтвамі і іншымі ўстановамі перавыдае (з каментарамі, ілюстрацыямі і інш.) найбольш рэдкія, каштоўныя і якія карыстаюцца актыўным попытам краязнаўчыя выданні са сваіх фондаў. Для забеспячэння надзейнай захаванасці вынікаў краязнаўчай бібліяграфічнай і навуковай дзейнасці ПБ пераважным з'яўляецца выданне ў папяровай форме.

ПБ актыўна і мэтанакіравана працуе па прасоўванні крыніц краязнаўчай інфармацыі ў сацыяльных медыя, ствараючы ў іх свае акаўнты і віртуальныя супольнасці. Яны выкарыстоўваюцца, у першую чаргу, для прыцягнення на сайт або раздзел сайта цэнтральнай ПБ (як галоўны сродак доступу да краязнаўчых рэсурсаў, прадуктаў і паслуг на ім), а таксама:

- для павышэння камфортнасці выкарыстання краязнаўчых паслуг (стварэнне дадатковай пляцоўкі віртуальнай краязнаўчай даведачнай службы);

- для пошуку партнёраў у краязнаўчай праектнай дзейнасці;

- для зносін і ўзаемадзеяння ў галіне краязнаўства зацікаўленых карыстальнікаў.

ПБ супрацоўнічае са СМІ, публікуючы інфармацыю аб сваіх краязнаўчых рэсурсах, прадуктах і паслугах, запланаваных і мінулых мерапрыемствах, акцыях і да т.п.

ПБ арганізуе і праводзіць масавыя мерапрыемствы, разлічаныя пераважна на жыхароў тэрыторыі і наведвальнікаў бібліятэкі (краязнаўчыя чытанні і семінары, выставы краязнаўчай літаратуры, краязнаўчыя лекторыі, сустрэчы з краязнаўцамі і аўтарамі кніг і інш.).

ПБ аказвае садзейнічанне дзейнасці краязнаўчых аб'яднанняў (таварыстваў, клубаў, грамадскіх краязнаўчых музеяў і інш.) і асобных краязнаўцаў.

Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы ПБ з'яўляюцца адчыненымі і агульнадаступнымі. Не дапускаюцца ніякія абмежаванні доступу да іх, звязаныя з характарам патрэбаў і запытаў, зместам запытаных дакументаў або інфармацыі (акрамя выпадкаў, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам).

Краязнаўчыя рэсурсы і прадукты, якія ствараюцца ПБ, з'яўляюцца яе інтэлектуальнай уласнасцю. Бібліятэка мае права кантраляваць капіраванне

значных па аб'ёме масіваў БЗ з каталогаў і абмяжоўваць яго праграмнымі або іншымі сродкамі; прымае меры, якія абараняюць ад пла-гіяту і неправамернага капіявання.

ПБ выкарыстоўвае ўсе магчымасці для прасоўвання, забеспячэння даступнасці і ўвядзення ў шырокі грамадскі і навуковы абарот у першую чаргу унікальных рэсурсаў: неапублікаваных краязнаўчых дакументаў і музейных прадметаў са сваіх фондаў.

Бібліятэкі вядуць краязнаўчую работу ў супрацоўніцтве і каардынацыі з іншымі арганізацыямі, дзейнасць якіх пэўным чынам звязана з краязнаўствам. Бібліятэка павінна выконваць вядучую ролю ў каардынацыі ўзаемадзеяння інстытутаў сацыяльнай памяці, выступаць ініцыятарам і галоўным удзельнікам карпаратыўнага супрацоўніцтва ў галіне краязнаўства.

Праблематыка сучаснага беларускага краязнаўства распрацоўваецца шэрагам навуковых і адукацыйных устаноў краіны, у тым ліку ўстановамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Інстытут гісторыі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры). Краязнаўчыя напрамкі з’яўляюцца прыярытэтнымі ў дзейнасці рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў – Беларускага фонду культуры, Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага таварыства аховы прыроды і інш.

Комплексныя веды аб малой радзіме генерыруюцца індывідуальнымі і калектыўнымі, прафесійнымі і аматарскімі суб’ектамі краязнаўчага руху. Сярод краязнаўчых арганізацый вылучаюцца навуковыя і навукова-асветныя таварыствы, краязнаўчыя арганізацыі пры ўстановах, гісторыка-краязнаўчыя цэнтры, клубы і інш.

Бібліятэкі ажыццяўляюць узаемадзеянне з іншымі ўстановамі, што знаходзяцца на тэрыторыі рэгіёна: музеямі, архівамі, інспекцыямі і аддзеламі па ахове аб’ектаў культурнай спадчыны, арганізацыямі навукі і адукацыі, грамадскімі таварыствамі, выдавецтвамі, краязнаўцамі-аматарамі.

Супрацоўніцтва бібліятэк з музеямі, архівамі, навучальнымі ўстановамі, краязнаўчымі таварыствамі можа быць у выглядзе: сумесных навуковых і выдавецкіх праектаў, мерапрыемстваў і конкурсаў; стварэння сумеснымі намаганнямі поўнамаштабных краязнаўчых рэсурсаў; доступу да перыядычных выданняў і іншых дакументаў для іх алічбоўкі; стварэння пры бібліятэках валанцёрскіх груп, якія ажыццяўляюць пошукава-даследчую дзейнасць.

Перспектыўны напрамак супрацоўніцтва рэгіянальных бібліятэк з музейнымі, архіўнымі і іншымі ўстановамі, што знаходзяцца на тэрыторыі рэгіёна, – наладжванне ўзаемадзеяння па пошуку, выяўленні нацыянальных і краязнаўчых дакументаў у фондах гэтых устаноў і ўвядзенні інфармацыі ў навуковы абарот.

Бібліятэкі ўдзельнічаюць у пошуку і далучэнні да супрацоўніцтва асоб, якія займаюцца краязнаўчай дзейнасцю, з’яўляюцца носьбітамі краязнаўчай

інфармацыі або захоўваюць матэрыялы краязнаўчага характару (афіцыйныя дакументы, фотаздымкі, рукапісы і інш.), арганізоўваюць збор успамінаў і да т. п.

Бібліятэкі, у першую чаргу тыя, што знаходзяцца на тэрыторыях, якія маюць цесныя гістарычныя, культурныя, роднасныя сувязі з суседнімі тэрыторыямі замежных краін, ажыццяўляюць міжнароднае супрацоўніцтва па розных напрамках, у тым ліку ў галіне краязнаўства.

## Раздзел 2 Асноўныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк

### Тэма 2.1 Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўству

Інфармацыйны рэсурс – арганізаваная сукупнасць дакументаванай інфармацыі, якая ўключае базы даных, іншыя сукупнасці ўзаемазвязанай інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах.

Бібліятэчныя фонды краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў з’яўляюцца структурнымі часткамі агульнага фонду бібліятэкі, унікальнымі часткамі сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду. Фарміруюцца па прынцыпе максімальнай паўнаты з разлікам на актыўнае выкарыстанне і пастаяннае захоўванне.

У фонд краязнаўчых дакументаў уключаюцца:

апублікаваныя дакументы, як поўнасцю прысвечаныя рэгіёну (яго частцы), так і тыя, што ўтрымліваюць значныя па аб’ёме ці каштоўнасці звесткі аб ім, незалежна ад фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы і інш.), тыпу і віду, мовы, часу і месца выдання/стварэння, аўтарскай прыналежнасці, тыражу;

неапублікаваныя/непублікуемыя дакументы (рукапісы, калекцыі фотаздымкаў, зборы выяўленчых матэрыялаў, лісты, дзённікі і інш.);

электронныя копіі краязнаўчых дакументаў (створаныя ў мэтах забеспячэння захаванасці арыгіналаў або атрыманыя замест арыгіналаў);

сеткавыя электронныя краязнаўчыя дакументы.

У фонд мясцовых выданняў уключаюцца дакументы, выдадзеныя на тэрыторыі рэгіёна, незалежна ад зместу, фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы, мікрафільмы і мікрафішы), тыпу і віду, мовы і часу выдання.

У рабоце па фарміраванні фонда краязнаўчых і мясцовых дакументаў вылучаюцца наступныя працэсы: мадэляванне фонда, выяўленне, адбор і планамернае набыццё дакументаў для яго папаўнення, апрацоўка, улік, расстаноўка дакументаў, алічбоўка, забеспячэнне іх захаванасці.

Рэгіянальныя бібліятэкі ажыццяўляюць бягучае і рэтраспектыўнае камплектаванне фондаў краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, выкарыстоўваючы ў якасці крыніц: абавязковы экзэмпляр выданняў; дагаворы з мясцовымі выдавецкімі ўстановамі і арганізацыямі; падпіску; дары; кнігаабмен; унутрырэспубліканскае пераразмеркаванне дакументаў; закупку (у тым ліку на аўкцыёнах і ў прыватных асоб); алічбоўку; капіраванне і рэпрадуцыраванне экзэмпляраў дакументаў, якія адсутнічаюць ці маюцца ў недастатковай колькасці.

Рэгіянальныя бібліятэкі вядуць сістэматычную работу па выяўленні краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, выкарыстоўваючы для гэтага выдавецкую і кнігагандлёвую інфармацыю, бібліяграфічныя крыніцы, ЭІР іншых бібліятэк, інтэрнэт-сайты і інш.

У мэтах забеспячэння надзейнай захаванасці і рацыянальнага выкарыстання краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні вылучаюцца ў самастойныя падфонды асноўнага фонду бібліятэкі.

Фонд краязнаўчых дакументаў (ці яго актыўная частка) можа знаходзіцца ў краязнаўчым падраздзяленні, а спецыялізаваныя часткі (спецвіды тэхнічнай літаратуры, нотныя, картаграфічныя, выяўленчыя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы, выданнні на замежных мовах, рэдкія выданні, рукапісныя і архіўныя матэрыялы і г. д.) – у адпаведных падраздзяленнях.

Функцыі дэпазітарнага захоўвання краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў на тэрыторыі свайго краю выконваюць абласныя бібліятэкі. Дэпазітарны фонд краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў уключае ўсе дакументы незалежна ад крыніц паступлення, практычнай і навуковай каштоўнасці, запатрабаванасці карыстальнікамі і месца захоўвання ў бібліятэцы. Краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні не могуць выключацца з дэпазітарнага фонду па прычыне маральнай састарэласці, наяўнасці перавыданняў, нізкага попыту. Асноўнай прычынай для спісання можа быць пашкоджанасць, дрэнны стан выданняў (толькі пры наяўнасці дастатковай колькасці экзэмпляраў і немэтазгоднасці рэстаўрацыі). Падставамі для выключэння з фонду залішне дублетных экзэмпляраў можа быць іх пераразмеркаванне або абмен. Бібліятэкі распрацоўваюць і ажыццяўляюць меры па забеспячэнні захаванасці фондаў краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, якія прадугледжваюць:

кантроль умоў захавання і выкарыстання;

рэгулярнае абследаванне фізічнага стану (з выяўленнем экзэмпляраў, якія патрабуюць тэрміновай кансервацыі ці рэстаўрацыі, абмежаванага выкарыстання, першачарговага капіравання і пераводу на іншыя носьбіты інфармацыі);

рэгуляванне ўмоў прадастаўлення карыстальнікам унікальных (неапублікаваных, рэдкіх і тых, якія захоўваюцца ў бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры) краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў;

планамернае стварэнне страхавых і архіўных копій.

У “Руководстве по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018) таксама вызначаецца, што фонды краязнаўчых і мясцовых выданняў фарміруюцца па прынцыпе вычарпальнай паўнаты і разглядаюцца як асабліва каштоўныя; як унікальная частка сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фону.

Падфонды (архівы) неапублікаваных і сеткавых краязнаўчых дакументаў фарміруюцца выбарачна, з улікам іх інфармацыйнай каштоўнасці.

У фонд мясцовых выданняў уключаюцца дакументы, выдадзеныя на дадзенай тэрыторыі і/ці па замове мясцовых устаноў за яе межамі, – незалежна ад зместу, фізічнай формы, тыпу і віду выдання, мовы і часу выхаду ў свет.

У фонд краязнаўчых дакументаў уключаюцца дакументы, цалкам прысвечаныя дадзенай тэрыторыі або змяшчаюць значныя па аб'ёме або каштоўнасці звесткі пра яе:

- краязнаўчыя выданні, незалежна ад фізічнай формы, тыпу і віду выдання, мовы, часу і месца выдання (вырабу, стварэння);
- неапублікаваныя дакументы (рукапісы, фатаграфіі, лісты, дзённікі і інш.), якія перадаюцца ў бібліятэку на пастаяннае захоўванне прыватнымі асобамі або ўстановамі;
- электронныя копіі неапублікаваных краязнаўчых дакументаў (створаныя ў мэтах забеспячэння захаванасці арыгіналаў або атрыманыя замест арыгіналаў);
- сеткавыя краязнаўчыя дакументы, адабраныя па крытэрыях аўтарытэтнасці, інфарматыўнасці, фундаванасці (наяўнасці і якасці спасылак на крыніцы), арыгінальнасці, унікальнасці зместу і правамерна скапіяваныя з Сеткі;
- асноўныя краязнаўчыя выданні аб рэгіёне (афіцыйныя дакументы органаў улады і кіравання рэгіёна, даведачныя, статыстычныя выданні, літаратура ўніверсальнага і комплекснага зместу і інш.).

Электронныя копіі неапублікаваных краязнаўчых дакументаў і сеткавыя краязнаўчыя дакументы ўключаюцца ў спецыялізаваны падфонд – электронны краязнаўчы архіў, прызначаны ў першую чаргу для забеспячэння іх гарантаванай захаванасці (як унікальных і эфемерных).

Электронныя краязнаўчыя архівы фарміруюцца ва ўсіх ПБ.

Цэнтральная ПБ вядзе сістэматычную працу па выяўленні мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў, выкарыстоўваючы для гэтага выдавецкую і кнігагандлёвую інфармацыю, бібліяграфічныя крыніцы, КДБА іншых бібліятэк, непасрэднае абследаванне фондаў, рэсурсы Інтэрнэт, краязнаўчыя дакументы і інш.

У цэнтральнай ПБ у мэтах забеспячэння надзейнай захаванасці і рацыянальнага выкарыстання мясцовыя і краязнаўчыя выданні вылучаюцца ў самастойныя фонды.

Фонд краязнаўчых выданняў (ці яго актыўна выкарыстоўваемая частка) знаходзіцца ў краязнаўчым падраздзяленні або фондзе чытальнай залы, фонд (калекцыя) мясцовых выданняў – у аддзеле кнігазахавання. У мясцовай ПБ краязнаўчыя выданні могуць быць выдзелены ў самастойны фонд пры значным аб'ёме.

Фонд краязнаўчых выданняў арганізуецца ў сістэматычным парадку ў адпаведнасці з прынятай у бібліятэцы схемай у разліку на магчымасці непасрэднага выкарыстання ў абслугоўванні чытачоў.

Неапублікаваныя краязнаўчыя дакументы (рукапісы, фатаграфіі, лісты, дзённікі і інш.) прымаюцца на захоўванне, улічваюцца і захоўваюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, усталяванымі для архіўных устаноў.

Прычынамі выключэння мясцовых і краязнаўчых выданняў з фондаў могуць быць залішняя колькасць экзэмпляраў або трухлявасць (пры наяўнасці дастатковай колькасці экзэмпляраў і немэтазгоднасці рэстаўрацыі). Яны не могуць выключацца з прычыны маральнай састарэласці, наяўнасці пазнейшых перавыданняў, нізкага попыту.

Звесткі аб краязнаўчых і мясцовых выданнях, намечаных да выключэння з фонду, папярэдне паведамляюцца ў цэнтральную ПБ і цэнтральную бібліятэку рэгіёну для таго, каб прадухіліць раніцу рэдкіх і ўнікальных экзэмпляраў.

Бібліятэка забяспечвае захаванасць мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў:

- рэгулярна абследуе іх фізічны стан (з вылучэннем экзэмпляраў, якія патрабуюць тэрміновай кансервацыі або рэстаўрацыі, абмежаванні выкарыстання, першачарговага капіявання і пераводу на іншыя носьбіты інфармацыі);
- кантралюе ўмовы іх захоўвання і выкарыстання;
- рэгулюе ўмовы прадастаўлення карыстальнікам унікальных (неапублікаваных, рэдкіх і наяўных у бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры) мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў.

Асабліва разглядаецца праца з першаснымі крыніцамі краязнаўчай інфармацыі. Фармаванню фондаў неапублікаваных дакументаў і музейных прадметаў.

Усе ПБ вядуць працу па зборы, апрацоўцы, захаванні, забеспячэнні даступнасці і прасоўванні першасных крыніц краязнаўчай інфармацыі: неапублікаваных дакументаў і музейных прадметаў. Яе мэтамі з'яўляюцца:

- забеспячэнне паўнаты інфармацыі аб тэрыторыі;
- захаванне памяці мясцовай супольнасці;

- фарміраванне і развіццё краязнаўчых інфармацыйных патрэбаў у членаў мясцовай супольнасці (шляхам уцягвання іх у краязнаўчую дзейнасць).

Праца з неапублікаванымі дакументамі і музейнымі прадметамі цесна звязана з традыцыйнай бібліятэчнай у фарміраванні электронных краязнаўчых каталогаў, стварэнні краязнаўчых прадуктаў і прасоўванні крыніц краязнаўчай інфармацыі (пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, выставак, на сайце).

Гэтая праца мае асаблівае значэнне пры адсутнасці на дадзенай тэрыторыі музеяў.

У рамках гэтай працы ПБ:

- дакументуе краязнаўчую інфармацыю: запісвае вусную або візуальную краязнаўчую інфармацыю на адпаведныя матэрыяльныя носьбіты; стварае краязнаўчыя дакументы і садзейнічае іх стварэнню (мясцовымі жыхарамі або краязнаўцамі-даследчыкамі);
- збірае, апрацоўвае і захоўвае неапублікаваныя краязнаўчыя дакументы і музейныя прадметы;
- падае неапублікаваныя дакументы і музейныя прадметы карыстальнікам;
- публікуе дакументы са свайго архіўнага фонду (ці садзейнічае іх публікацыі), а таксама распаўсюджвае інфармацыю аб іх і аб музейных прадметах.

Для публікацыі архіўных дакументаў выкарыстоўваюцца друкаваныя і электронныя выданні. Публікацыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзейнымі правіламі выдання гістарычных дакументаў, як правіла, пры кансультацыйнай дапамозе спецыялістаў-гісторыкаў, супрацоўнікаў дзяржаўных архіваў і цэнтральнай бібліятэкі рэгіёну.

Для прамоцыі інфармацыі аб неапублікаваных дакументах і музейных прадметах выкарыстоўваюцца пастаянна дзейныя экспазіцыі, выставы і масавыя мерапрыемствы; даступныя сайты або раздзелы сайта (самай ПБ, цэнтральнай ПБ, цэнтральнай бібліятэкі рэгіёна) і акаўнты ў сацыяльных медыя; краязнаўчыя прадукты ўласнай генерацыі, спецыяльныя (віртуальныя музеі і выставы) або якія ўключаюць неапублікаваныя дакументы і музейныя прадметы нараўне з апублікаванымі дакументамі; публікацыі ў СМІ і выданнях (уласных, цэнтральнай бібліятэкі рэгіёна і любых іншых).

Праца з першаснымі крыніцамі краязнаўчай інфармацыі ажыццяўляецца планава і мэтанакіравана, на аснове пастаяннага аналізу інфармацыйнай забяспечанасці тэрыторыі і яе аб’ектаў. Для фармавання фонду (архіва) неапублікаваных дакументаў і музейнага фонду выкарыстоўваюцца:

- запіс “вуснай гісторыі”;
- відэазапісы мясцовых падзей, рамёстваў, абрадаў і звычаяў, людзей і інш.;

- збор (прыём) дакументаў і прадметаў у мясцовых жыхароў і іншых асоб;

- вядзенне летапісаў і хронік жыцця мясцовай супольнасці.

Атрыманыя матэрыялы паступаюць:

- у фонд (архіў) неапублікаваных дакументаў (рукапісы, малюнкі, фатаграфіі, аўдыёзапісы і вынікі іх расшыфроўкі, відэазапісы);

- у музейную калекцыю (трохмерныя прадметы).

Комплекс апублікаваных і неапублікаваных дакументаў і музейных прадметаў адзінага паходжання (напрыклад, прыналежных адной асобе, якія адносяцца да адной падзеі і т. п.) улічваецца цалкам як музейная калекцыя. Пры гэтым усе апублікаваныя і неапублікаваныя дакументы ў яе складзе праходзяць індывідуальную бібліяграфічную апрацоўку і адлюстроўваюцца ў ЭКК і (калі трэба) у ЭКМІ.

Прыём, апрацоўка, захоўванне і прадастаўленне карыстальнікам неапублікаваных дакументаў здзяйсняюцца па правілах, прынятым у архівах РФ; музейных прадметаў – па правілах, прынятых у музеях РФ.

Музейны фонд у бібліятэцы складаецца з асноўнага (уключаючага сапраўдныя прадметы) і навукова-дапаможнага (уключаючага копіі, неаўтарскія макеты, муляжы, прыродазнаўчыя калекцыі і інш.). Бібліятэкі прымаюць музейныя прадметы на пастаяннае захоўванне ў асноўны фонд толькі пры наяўнасці ўмоў для забеспячэння іх гарантаванай захаванасці. У той жа час яны могуць без абмежаванняў (пры згодзе ўладальнікаў) прымаць прадметы на часовае захоўванне для экспанавання і навуковага апісання. У навукова-дапаможны фонд прадметы прымаюцца без абмежаванняў.

У музейны фонд бібліятэкі ні пры якіх умовах не прымаюцца на захоўванне:

- вырабы, якія змяшчаюць каштметалы і каштоўныя камяні;

- зброя і боепрыпасы;

- дзяржаўныя ўзнагароды;

- археалагічныя калекцыі.

У фонд (архіў) неапублікаваных дакументаў уключаюцца як арыгіналы, так і копіі неапублікаваных дакументаў (калі арыгінал адсутнічае або захоўваецца ва ўладальніка); у музейны фонд - як сапраўдныя прадметы, так і навукова-дапаможныя матэрыялы, неабходныя для стварэння экспазіцыі.

Інфармацыя аб усіх неапублікаваных дакументах, якія захоўваюцца ў мясцовай ПБ, паступае ў цэнтральную ПБ і адлюстроўваецца ў яе ЭКК, а копіі саміх дакументаў уключаюцца ў электронны краязнаўчы архіў цэнтр.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (далей − КДБА) уяўляе сабой спецыялізаваную частку даведачна-бібліяграфічнага апарата (далей − ДБА) рэгіянальнай бібліятэкі, скіраваную на максімальна поўнае раскрыццё складу і зместу краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў.

КДБА ўключае звесткі:

пра ўсе апублікаваныя краязнаўчыя дакументы (незалежна ад фізічнай формы, мовы, месца і часу выдання, ідэйнай накіраваннасці, наяўнасці ў бібліятэцы), а таксама аб усіх неапублікаваных/непублікуемых краязнаўчых дакументах, якія захоўваюцца ў фондах бібліятэкі;

пра ўсе мясцовыя выданні, незалежна ад фізічнай формы, зместу, часу стварэння і інш.

У склад КДБА могуць уваходзіць:

краязнаўчыя ЭІР;

карткавыя каталогі і картатэкі;

краязнаўчыя даведачныя і бібліяграфічныя выданні;

неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі, архіў выкананых даведак краязнаўчай тэматыкі.

Краязнаўчыя ЭІР прадстаўляюць сабой частку электроннага ДБА бібліятэкі.

Бібліятэкі ствараюць бібліяграфічныя, фактаграфічныя, паўнатэкставыя, камбінаваныя і іншыя рэсурсы краязнаўчага характару. Універсальныя БД, у якіх адлюстроўваюцца звесткі пра краязнаўчыя і мясцовыя дакументы, з’яўляюцца часткай агульных ЭК рэгіянальных бібліятэк.

Зводныя масівы бібліяграфічнай інфармацыі пра краязнаўчыя і мясцовыя дакументы, якія фарміруюць бібліятэкі абласцей, адлюстроўваюцца ў рэгіянальных зводных электронных каталогах (далей − РЗЭК).

Акрамя ЭІР, якія фарміруюцца ў самой бібліятэцы, у склад КДБА ўваходзяць знешнія электронныя інфармацыйныя рэсурсы (выдавецтваў-агрэгатараў і іншых устаноў).

Фонд даведачных і бібліяграфічных выданняў уключае афіцыйныя, нарматыўныя, даведачныя (энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі) і бібліяграфічныя выданні ў друкаванай і электроннай формах.

Архіў выкананых даведак – частка КДБА, якая ўяўляе сабой збор выкананых раней пісьмовых бібліяграфічных даведак (перш за ўсё тэматычных). Гэта могуць быць копіі адказаў на складаныя разавыя запыты, якія патрабавалі бібліяграфічных пошукаў і кансультацый са спецыялістамі, а таксама копіі даведак па актуальных, неаднаразова паўтараемых запытах.

КДБА з’яўляецца адкрытым і агульнадаступным, у тым ліку для аддаленых карыстальнікаў. Бібліятэка павінна забяспечыць доступ у інтэрнэт-асяроддзі да тых элементаў КДБА, якія існуюць у электронным выглядзе, і прадугледзець паэтапны перавод у электронную форму астатніх элементаў (рэтраканверсія, алічбоўка і інш.).

Краязнаўчыя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, ствараемыя бібліятэкай, з’яўляюцца яе інтэлектуальнай уласнасцю.

У “Руководстве по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018) таксама вызначаецца, што

сістэма краязнаўчых БД цэнтральнай ПБ уключае базавыя (абавязковыя) і факультатыўныя элементы. Да базавых адносяцца:

- электронны краязнаўчы каталог;
- электронны каталог мясцовых выданняў;
- Універсальная фактаграфічная краязнаўчая БД (УФКБД).

Да факультатыўных элементаў адносяцца:

- рэалізаваныя ў форме адкрытых да папаўнення БД краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты ўласнай генерацыі (якія ствараюцца на аснове базавых);
- БД, створаныя за межамі цэнтральнай ПБ (набытыя або выкарыстоўваюцца на дагаворнай аснове).

Электронны краязнаўчы каталог (далей – ЭКК) і/ці электронны каталог мясцовых выданняў (далей – ЭКМІ) могуць быць аб'яднаны ці інтэграваныя ў электронны каталог цэнтральнай ПБ пры ўмовах:

- захавання цэласнасці ЭКК і ЭКМИ (прамога доступу да запісаў адпаведна на ўсе краязнаўчыя дакументы і на ўсе мясцовыя выданні);
- захавання ўсіх патрабаванняў да змешчаных у іх БЗ.

Цэнтральная ПБ, якая ўдзельнічае ў фарміраванні рэгіянальных карпаратыўных электронных краязнаўчых каталогаў, ЭКМІ і УФКБД, можа адмовіцца ад вядзення аналагічных уласных БД пры ўмове гарантаванага пастаяннага доступу да названых карпаратыўных электронных каталогаў.

Кіруючым цэнтрам усіх базавых элементаў, якія забяспечваюць іх аўтарытэтную падтрымку і ўзаемасувязь, з'яўляецца адзіны рэгіянальны аўтарытэтны файл, які фарміруецца ў працэсе вядзення карпаратыўнага ЭКК рэгіёну.

ЭКК уключае бібліяграфічныя запісы на ўсе віды краязнаўчых дакументаў аб тэрыторыі, незалежна ад месца захоўвання (у тым ліку – дакументаў, вядомых толькі па крыніцах):

- краязнаўчыя выданні (па прынцыпе вычарпальнай паўнаты);
- неапублікаваныя краязнаўчыя дакументы, якія захоўваюцца ў фондзе (архіве) ПБ;
- копіі сеткавых краязнаўчых дакументаў, уключаныя ў электронны краязнаўчы архіў;
- краязнаўчыя публікацыі з краязнаўчых і любых іншых дакументаў (выбарачна, па крытэрах аўтарытэтнасці, інфарматыўнасці, фундаванасці, арыгінальнасці, унікальнасці зместу); а таксама краязнаўчыя выданні аб рэгіёне, якія ёсць у фондзе ПБ.

ЭКМІ ўключае па прынцыпе вычарпальнай паўнаты бібліяграфічныя запісы на ўсе віды мясцовых выданняў, незалежна ад зместу, фізічнай формы, тыпу, віду, мовы і часу выхаду ў свет – і незалежна ад месца захоўвання (у тым ліку выданняў, вядомых толькі па крыніцах).

УФКБД фарміруецца па тыпе краязнаўчага календара або краязнаўчай электроннай энцыклапедыі. Яна ўключае фактаграфічныя даведкі аб

персонах, калектывах, геаграфічных аб'ектах, падзеях, і т. п., заснаваныя на дакументах і якія суправаджаюцца бібліяграфічнымі апісаннямі гэтых дакументаў.

ЭКК і ЭКМІ ўключаюць БЗ на ўсе мясцовыя выданні і краязнаўчыя дакументы, незалежна ад іх наяўнасці ў іншых БД цэнтральнай ПБ, і з'яўляюцца ў гэтых адносінах самадастатковымі.

Сістэма краязнаўчых БД звязана з іншымі элементамі электроннага даведачна-бібліяграфічнага апарата бібліятэкі ў лакальнай сетцы. Гэтым забяспечваецца тэхналагічная магчымасць аднаразовай апрацоўкі краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, аператыўнага і камфортнага бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання чытачоў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў.

Цэнтральная ПБ вядзе толькі такія картачныя каталогі і картатэкі, якія захоўваюць сваё значэнне ў якасці страхавой копіі і сродкі доступу да краязнаўчых рэсурсаў: як правіла, краязнаўчы сістэматычны каталог (картатэку) і каталог мясцовых выданняў. Не ствараюцца і не падтрымліваюцца краязнаўчыя тэматычныя і персанальныя картатэкі, якія дублююць адпаведную інфармацыю з ЭКК.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд з’яўляецца спецыялізаванай часткай краязнаўчага фонду цэнтральнай ПБ і ўключае апублікаваныя і неапублікаваныя дакументы даведачна-га або бібліяграфічнага характару ў друкаванай і электроннай форме.

Тэматычныя падборкі краязнаўчых публікацый захоўваюцца часова – да стварэння аналагічнай электроннай краязнаўчай калекцыі. Яны ўключаюць толькі копіі публікацый, якія абавязкова суправаджаюцца дакладнымі бібліяграфічнымі апісаннямі, уключанымі ў ЭКК або (пры яго адсутнасці) у краязнаўчую картатэку.

Краязнаўчы ДБА цэнтральнай ПБ з’яўляецца адкрытым і агульнадаступным. Бібліятэка забяспечвае доступ у сетцы Інтэрнэт да элементаў краязнаўчага ДБА, якія існуюць у электронным выглядзе, і па-этапны перавод у электронную форму астатніх элементаў (рэтраканверсію каталогаў, аблічбоўку выданьняў і інш.).

Базавыя элементы краязнаўчага ДБА (ЭКМІ, ЭКК і УФКБД) і картачныя краязнаўчыя каталогі і картатэкі разглядаюцца як унікальныя і асабліва каштоўныя дакументы. Таму цэнтральная ПБ прымае меры для забеспячэння іх гарантаванай захаванасці:

- рэтраканверсію картачных каталогаў і картатэк у электронную форму;
- абмежаванне самастойнага доступу карыстальнікаў да картачных каталогаў і картатэкаў;
- рэгулярнае рэзервовае капіраванне ЭКМІ, ЭКК і УФКБД;
- абарону ЭКМІ, ЭКК і УФКБД ад несанкцыянаванага доступу праграмнымі сродкамі.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца фарміраванню універсальнай фактаграфічнай краязнаўчай базы даных (УФКБД),

Мэты фарміравання УФКБД:

- забеспячэнне найбольш частай у краязнаўстве патрэбнасці ў фактаграфічнай інфармацыі;

- кантроль інфармацыйнага пакрыцця тэрыторыі і на гэтай аснове планаванне ўсёй краязнаўчай дзейнасці;

Гэтая дзейнасць носіць планавы характар і засноўваецца на выніках абследавання інфармацыйнай забяспечанасці розных краязнаўчых аб'ектаў на сваёй тэрыторыі (геаграфічных аб'ектаў, помнікаў прыроды, гісторыі і культуры, гістарычных падзей, устаноў, катэгорый персон і інш.). З пункту гледжання зместу УФКБД імкнецца да максімальна поўнага інфармацыйнага пакрыцця сваёй тэрыторыі.

Вынікі працы адлюстроўваюцца ў УФКБД – адзінай для муніцыпальнага раёна або гарадскога акругі. Гэтая БД вядзецца ў цэнтральнай ПБ - пры ўдзеле мясцовых ПБ, якія ствараюць і / або карэкціруюць даведкі па сваіх тэрыторыях.

УФКБД з'яўляецца энцыклапедычнай па зместу. У яе ўключаюцца (без абмежаванняў) усе мясцовыя аб'екты:

- персоны: асобы, звязаныя з тэрыторыяй біяграфічна (ураджэнцы, жыхары) або творча (даследчыкі, аўтары работ);

- сем'і, роды і дынастыі мясцовых жыхароў;

- установы і прадпрыемствы; таварыствы і грамадскія арганізацыі і інш.

- геаграфічныя аб'екты (адміністрацыйныя адзінкі; фізіка-геаграфічныя аб'екты, населеныя пункты, гістарычныя мясцовасці);

- помнікі прыроды, архітэктуры, гісторыі і культуры;

- іншыя ўнікальныя аб'екты (музейныя прадметы і калекцыі, рукапісы і інш.);

- значныя сучасныя культурныя, спартыўныя, палітычныя падзеі;

- гістарычныя падзеі (мясцовай гісторыі; расійскай гісторыі ў прывязцы да дадзенай тэрыторыі).

Абавязковай (і адзінай) умовай уключэння артыкула ва УФКБД з'яўляецца наяўнасць даступных крыніц звестак аб аб'екце (апублікаваных; неапублікаваных архіўных; сеткавых, якія захоўваюцца ў электронным краязнаўчым архіве).

Для УФКБД абавязковыя наступныя патрабаванні:

- наяўнасць карэктных спасылак на крыніцы;

- у тэкстах артыкулаў – прытрымліванне пэўнай структуры звестак (сваёй для кожнай катэгорыі мясцовых аб'ектаў);

- адзіная структура даведачнага апарата артыкулаў (якая ўключае «крыніцы», «літаратуру» і для артыкулаў аб персонах-аўтарах «сачыненні»);

- указанне аўтараў артыкулаў;

- забеспячэнне пошуку па прадметах, геаграфічным назвам і храналогіі (датам і любым інтэрвалам дат);

Па-магчымасці збіраюцца і ўключаюцца выявы аб'ектаў.

Бібліятэкі ажыццяўляюць аналітыка-сінтэтычную перапрацоўку краязнаўчых і мясцовых дакументаў і адлюстроўваюць звесткі аб іх у сваіх локальных ЭК. Бібліяграфічныя запісы (далей – БЗ) на краязнаўчыя і мясцовыя дакументы ствараюцца ў разліку на іх далейшае прадстаўленне (пры дапамозе экспарту/імпарту) у рэгіянальных зводных электронных каталогах, ЭІР "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі", а таксама на іх удзел у рэгіянальным, нацыянальным, международным інфармацыйным абмене.

РЗЭКі разглядаюцца ў якасці зводных рэсурсаў краязнаўчых метаданых па сваёй вобласці. БЗ на нацыянальныя/краязнаўчыя дакументы, змешчаныя ў РЗЭКах, удзельнічаюць таксама ў агульнай пошукавай сістэме ЭІР "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі".

Абласная бібліятэка як базавая ў сваім рэгіёне (бібліятэка-агрэгатар) арганізоўвае і каардынуе работу бібліятэк – удзельніц абластнага РЗЭК, размяркоўвае абавязкі паміж бібліятэкамі ў мэтах рацыянальнага выкарыстання кадравых рэсурсаў і працоўнага часу, пазбягання дублетнасці.

Каардынацыя дзейнасці паміж удзельнікамі РЗЭК абласнога і раённага ўзроўняў можа быць у выглядзе размеркавання выданняў для аналітычнага роспісу (напрыклад, раённыя бібліятэкі распісваюць мясцовыя перыядычныя выданні, зборнікі і інш., абласная бібліятэка – рэспубліканскія і абласныя выданні). Тэхналогія размеркавання абавязкаў па фарміраванні РЗЭКаў можа будавацца і па іншых прынцыпах (вырашаецца ў кожнай вобласці самастойна).

БЗ на краязнаўчыя і мясцовыя дакументы павінны адпавядаць патрабаванням доступнасці, паўнаты і якасці, што забяспечваецца:

выкарыстаннем нацыянальнага камунікатыўнага фармату (BELMARC) ці аднаго з міжнародных фарматаў, што забяспечвае даступнасць інфармацыі для іншых бібліятэк і карыстальнікаў;

абавязковым апісаннем de visu дакументаў, месца захоўвання якіх вядома, выкарыстаннем для аналізу дакументаў дадатковых крыніц інфармацыі (пры неабходнасці);

паўнатой бібліяграфічнай характарыстыкі, г. зн. запаўненнем усіх палёў і падпалёў фармату са статусамі "абавязковыя" і "ўмоўна абавязковыя" ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючых стандартаў і правілаў каталагізацыі;

стварэннем усіх неабходных кропак доступу на нацыянальныя/рэгіянальныя аб'екты;

глыбінёй сэнсавай апрацоўкі, складаннем максімальна поўных пошукавых вобразаў дакументаў;

абавязковасцю абазначэння месца захоўвання (установы, якая з'яўляецца ўласнікам дакумента), калі гэтыя звесткі вядомыя;

выкарыстаннем анатацыі ў выпадках невыразнай ідэнтыфікацыі дакумента як нацыянальнага/краязнаўчага.

Аптымальным лінгвістычным сродкам для працэсаў індэксавання дакументаў, арганізацыі фондаў, пошуку беларусазнаўчай і краязнаўчай інфармацыі, запазычвання БЗ у сістэме карпаратыўнай каталагізацыі з'яўляецца Універсальная дзесятковая класіфікацыя (УДК) на беларускай мове. Данае палажэнне, на наш погляд, не адпавядае традыцыям краязнаўчай дзейнасці бібліятэк краіны.

Абавязковай з'яўляецца фіксацыя ў БЗ прыметы нацыянальнага дакумента (поле 615 са значэннем "Беларускі нацыянальны дакумент"). Для краязнаўчых дакументаў, выдадзеных за межамі Беларусі, поле пашыраецца дадатковым элементам – падполем $x (са значэннем “экстэрыёрыка”).

Унікальнасць РСЭК кожнай вобласці заключаецца ў тым, што ў іх прадстаўлены метаданыя краязнаўчых і мясцовых дакументаў, для якіх РЗЭК выступае асноўнай крыніцай адлюстравання бібліяграфічнай інфармацыі. У рамках рашэння адной з задач разгляданага карпаратыўнага рэсурсу лічым неабходным звярнуць увагу на некаторыя пытанні фармавання яго краязнаўчага кампанента.

З мэтай уніфікацыі падыходаў да фарміравання метададзеных краязнаўчых дакументаў і адлюстравання спецыфікі фарміравання зводных краязнаўчых каталогаў, закліканых вычарпальна поўна адлюстроўваць інфармацыю аб краязнаўчых дакументах, незалежна ад месца іх захоўвання, магчыма дапоўніць пералік асноўных тэрмінаў і значэнняў Палажэння “Аб рэгіянальным зводным вобласці такімі паняццямі, як: «краязнаўчы дакумент», «мясцовы дакумент», «дакументы ўраджэнцаў і дзеячаў рэгіёну », «змястоўная краязнаўчая экстэрыёрыка», «аўтарская краязнаўчая экстэрыёрыка» і ўдакладніць крытэры адбору дадзеных відаў дакументаў.

Улічваючы неабходнасць паўнаты ўліку дакументаў, выдадзеных на тэрыторыі рэгіёна, тым самым прымаючы ўдзел у стварэнні нацыянальнай бібліяграфіі, лічым мэтазгодным у структуры РЗЭК вылучэнне калекцыі мясцовых дакументаў.

Зыходзячы з таго, што метаданыя па краязнаўстве ў асноўным прадстаўлены БЗ на складовыя часткі дакументаў, якія ствараюцца рэгіянальнымі бібліятэкамі самастойна, абласным бібліятэкам пажадана забяспечыць уніфікацыю методыкі выкарыстання неўніфікаваных тэматычных тэрмінаў з улікам традыцый.

Для адлюстравання краязнаўчай экстэрыёрыкі рэкамендуем выкарыстоўваць пошукавую функцыю РСЭК "шукаць таксама", рэалізацыя якой дае магчымасць ажыццяўляць дадатковы пошук крыніц у найбуйнейшых пошукавых рэсурсах адкрытага доступу (Open Access), такіх як: электронны каталог Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, WorldCat, Электронны каталог Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі і іншых, а таксама

сфарміраваць пералік рэсурсаў адкрытага доступу з улікам рэгіянальных інфармацыйных патрэб карыстальнікаў.

Для стварэння адзінай рэгіянальнай пошукавай сістэмы лічым мэтазгодным прадугледзець магчымасць інтэграцыі пошукавых магчымасцей РСЭК і рэгіянальных ЭІР бібліятэк, напрыклад, універсальных (“Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць”, “Край мой – Магілёўшчына”, “Памяць Міншчыны”) і іншых краязнаўчых баз даных.

Для вывучэння якасці прадстаўлення краязнаўчага кампанента ў РЗЭК неабходна, на наш погляд, рэалізаваць магчымасць атрымання статыстычных звестак аб наступных відах дакументаў: краязнаўчыя, мясцовыя дакументы, краязнаўчая экстэрыёрыка.

У мэтах ажыццяўлення сістэматычнай работы па павышэнні прафесійных кампетэнцый бібліятэкараў-бібліёграфаў рэгіянальных бібліятэк у галіне каталагізацыі, у прыватнасці, фарміраванню РЗЭК, лічым мэтазгодным распрацаваць і рэалізаваць Інстытуту павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі адпаведную адукацыйную праграму.

Бібліятэкі з’яўляюцца асноўнымі стваральнікамі, захавальнікамі і пастаўшчыкамі рэгіянальнай інфармацыі. Яны фарміруюць разнастайную прадукцыю (ЭІР, друкаваныя выданні, віртуальныя праекты, лічбавыя калекцыі, неапублікаваныя інфармацыйныя матэрыялы і інш.), прызначаную для задавальнення найбольш значных і ўстойлівых патрэб грамадства ў інфармацыі аб рэгіёнах і мясцовасцях.

Непасрэдную дзейнасць па стварэнні краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі мэтазгодна пачынаць з вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў, распрацоўкі рэпертуару прадукцыі (з улікам магчымасцяў кааперацыі і каардынацыі з бібліятэкамі і іншымі ўстановамі).

Абласная бібліятэка каардынуе дзейнасць іншых бібліятэк і небібліятэчных устаноў вобласці па стварэнні краязнаўчых ЭІР, бібліяграфічных выданняў; распрацоўвае методыку фарміравання краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі; аказвае метадычную і кансультацыйную дапамогу па гэтых пытаннях.

Бібліяграфічная прадукцыя рэгіянальных бібліятэк складаецца з двух блокаў:

бібліяграфічныя дапаможнікі, прысвечаныя краю: друкаваныя, рукапісныя, электронныя, інтэграваныя; навукова-дапаможныя, рэкамендацыйныя; бягучыя, рэтраспектыўныя; універсальныя, галіновыя, тэматычныя, персанальныя і інш.;

бібліяграфічныя дапаможнікі мясцовых выданняў (бібліяграфічныя рэпертуары ці зводныя рэтраспектыўныя каталогі мясцовых выданняў,

бягучыя паказальнікі мясцовых выданняў, паказальнікі зместу перыядычных выданняў і выданняў з працягам і інш.).

У працэсе краязнаўчай дзейнасці бібліятэкамі ствараюцца фактаграфічныя інфармацыйныя прадукты: календары знамянальных і памятных дат, хронікі падзей, папулярныя энцыклапедыі, біяграфічныя даведнікі, аналітычныя агляды і да т. п.

З мэтай папаўнення краязнаўчых фондаў і павышэння даступнасці краязнаўчай інфармацыі бібліятэкі могуць перавыдаваць найбольш каштоўныя і рэдкія краязнаўчыя выданні.

Да краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі адносяцца і неапублікаваныя матэрыялы, збіраемыя/ствараемыя бібліятэкамі: рукапісныя, выяўленчыя, фотаальбомы, тэматычныя падборкі выразак і копій артыкулаў з перыёдыкі і фрагментаў кніг, аўдыявідэазапісы з сюжэтамі аб мясцовых падзеях, гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна або населенага пункта, знакамітых і таленавітых жыхарах, турыстычных магчымасцях і г. д.

Прыярытэтным напрамкам з’яўляецца фарміраванне краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі ў лічбавым асяроддзі. Віды краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі ў электронным выглядзе: базы даных, сайты, віртуальныя выставы і праекты, мультымедыйныя выданні, прэзентацыі, аўдыявізуальныя матэрыялы, буктрэйлеры, блогі, навігатары па краязнаўчых рэсурсах, віртуальныя экскурсіі, падарожжы, анлайн-музеі, гістарычныя, літаратурныя анлайн-карты, інтэрактыўныя рэсурсы (віктарыны, квесты, анлайн-гульні) і інш.

У “Руководстве по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018) адзначаецца, што краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты не дубліруюць інфармацыю з ЭКК, ЭКМІ і УФКБД, а з'яўляюцца вынікам перапрацоўкі змешчаных у іх звестак у сувязі з канкрэтным мэтавым і карыстальніцкім прызначэннем: істотным паглыбленнем на аснове архіўных і іншых крыніц (бібліяграфічныя рэпертуары, найбольш каштоўных краязнаўчых выданняў і інш.) або адаптацыяй з улікам асаблівасцяў асобных катэгорый карыстальнікаў (рэкамендацыйныя паказальнікі і інш.). Як правіла, яны злучаюць у сабе бібліяграфічную аснову з фактаграфічнай інфармацыяй, поўнымі тэкстамі дакументаў, мапамі і інш.

Краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты, якія ствараюцца ПБ, у сукупнасці ўтвараюць сістэму, якая забяспечвае розныя "кропкі доступу" да краязнаўчых рэсурсаў:

- тэмы або прадметы: тэматычныя паказальнікі і БД;
- імёны: біяграфічныя і біябібліяграфічныя даведнікі;
- геаграфічныя назвы (у межах тэрыторыі): геаграфічныя даведнікі, даведнікі, універсальныя даведнікі і энцыклапедыі;
- даты: календары знамянальных дат, хронікі падзей, летапісы населеных месцаў і інш.;

- карты: інтэрактыўныя карты, віртуальныя экскурсіі і т. д.;

- выявы (людзей, геаграфічных аб'ектаў і інш.): віртуальныя выставы і музеі, калекцыі фатаграфій і інш.

Для краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў прыярытэтнымі з'яўляюцца задачы, накіраваныя на:

- удасканаленне базавых бібліяграфічных элементаў краязнаўчага ДБА (рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі мясцовых і краязнаўчых выданняў, паказальнікі зместу найбольш каштоўных краязнаўчых выданняў);

- забеспячэнне надзейнасці і паўнаты фактаграфічнай краязнаўчай інфармацыі як асновы даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання і аўтарытэтнай падтрымкі базавых бібліяграфічных каталогаў (краязнаўчыя энцыклапедыі або слоўнікі, геаграфічныя і біябібліяграфічныя даведнікі і інш.);

- прамоцыя ўнікальных і асабліва каштоўных краязнаўчых фондаў, калекцый, асобных мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў, якія мае ПБ (каталогі калекцый і кніжных помнікаў);

- забеспячэнне найбольш шырокіх і стабільных краязнаўчых інфармацыйных патрэб; запатрабаванняў адначасова некалькіх катэгорый карыстачоў (рэкамендацыйныя краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты).

Склад і відавая разнастайнасць ствараемых краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў не абмяжоўваюцца; маюць значэнне толькі абгрунтаванасць іх выбару і якасць.

## Тэма 2.2 Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству

Аператыўнае і камфортнае бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне чытачоў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў з’яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

Бібліятэка прадастаўляе доступ да ўсіх краязнаўчых і мясцовых дакументаў, якія захоўвае ў сваіх фондах. Выдача краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў ажыццяўляецца згодна агульным правілам карыстання бібліятэкай, якія дзейнічаюць у канкрэтнай бібліятэцы.

Краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні, якія маюцца ў бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры, выдаюцца для азнаямлення карыстальнікам толькі ў межах бібліятэкі. Бібліятэка мае права ў мэтах забеспячэння захаванасці прадастаўляць карыстальнікам копіі на папяровых, электронных ці іншых носьбітах.

Краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні выдаюцца па МБА ў іншыя бібліятэкі, за выключэннем адзіных экзэмпляраў, замест якіх высылаюцца копіі. Па запытах іншых бібліятэк і аддаленых карыстальнікаў копіі краязнаўчых і мясцовых дакументаў могуць дасылацца праз электронную дастаўку.

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўчых запытах ажыццяўляецца з выкарыстаннем усяго ДБА бібліятэкі, у першую чаргу, яго краязнаўчай часткі. Даведачна-бібліяграфічнае і кансультацыйнае абслугоўванне аддаленых карыстальнікаў ажыццяўляецца з дапамогай віртуальнай даведачнай службы, электроннай пошты, праз тэлефонную сувязь, сацыяльныя сеткі і г. д.

Бібліятэкі сістэматычна вядуць бібліяграфічнае інфармаванне аб краязнаўчых дакументах, што паступілі ў іх фонды або фонды іншых бібліятэк рэгіёна. Інфармаванне можа быць як масавым (на сайце бібліятэкі, у СМІ і інш.), так і індывідуальным або групавым (у адпаведнасці з канкрэтнымі краязнаўчымі бібліяграфічнымі запытамі асобных чытачоў ці калектываў).

Карыснымі, на наш погляд, зяўляюцца наступныя палажэнні “Руководства по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ” (Владимир, 2018):

неапублікаваныя краязнаўчыя дакументы (і іх электронныя копіі) прадастаўляюцца ў карыстанне ў адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі для архіўных дакументаў.

Доступ да электронных сеткавых дакументаў з электроннага краязнаўчага архіва, як правіла, прадастаўляецца ў выглядзе спасылкі на адпаведны знешні рэсурс; пры страце такой магчымасці (не-працуючай спасылцы) прадастаўляецца копія дакумента з электроннага архіва.

ПБ ажыццяўляе краязнаўчае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне наведвальнікаў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў. Яна прымае любыя краязнаўчыя запыты (аб тэрыторыі і аб рэгіёне), забяспечвае іх выкананне ўсімі даступнымі (не толькі ўласнымі) рэсурсамі і ў выпадку неабходнасці перанакіроўвае іх у цэнтральную ПБ або цэнтральную бібліятэку рэгіёна.

Цэнтрам краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання на сваёй тэрыторыі з'яўляецца цэнтральная ПБ. Яна стварае і падтрымлівае на сайце віртуальную краязнаўчую даведачную службу; ажыццяўляе фарміраванне даступны для карыстачоў архіў выкананых даведак і забяспечвае пошук па ім.

## Тэма 2.3 Навукова-метадычная і навукова-даследчая дзейнасць бібліятэкі па краязнаўству

Навуковымі даследаваннямі ў галіне краязнаўства займаюцца бібліятэкі рознага ўзроўню, тыпаў і відаў у адпаведнасці з іх профілем і напрамкамі дзейнасці. НББ рэалізуе шэраг навукова-даследчых і выдавецкіх праектаў, прысвечаных рэгіянальнай гісторыі і дакументнай спадчыне рэгіёнаў. Навукова-даследчы характар носіць праца, звязаная з пошукам, выяўленнем, зборам нацыянальных і краязнаўчых дакументаў, ліквідаваннем лакун нацыянальнай бібліяграфіі і да т. п.

Краязнаўчыя даследаванні бібліятэк уносяць уклад у развіццё гісторыі, крыніцазнаўства, краязнаўства, этнаграфіі, літаратуразнаўства, кнігазнаўства, геаграфіі, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і іншых напрамкаў. Праектная дзейнасць дае магчымасць пашырэння функцый бібліятэк, рэалізацыі асветніцкіх задач, актывізацыі дабрачыннай дзейнасці.

Абласная бібліятэка вядзе самастойныя даследчыя праекты ў галіне краязнаўства, арганізуе цэнтралізаваныя даследаванні ў бібліятэках вобласці, удзельнічае ў даследаваннях, якія арганізуюць іншыя установы свайго або іншых рэгіёнаў, а таксама ў міжнародных праектах (у першую чаргу, у рамках памежнага і трансмежнага супрацоўніцтва).

Навукова-даследчая работа (далей − НДР) абласных бібліятэк можа весціся па наступных кірунках: вывучэнне карыстальнікаў і іх патрэб у краязнаўчай інфармацыі; вывучэнне гісторыі і сучаснай практыкі краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці; вывучэнне кніжных фондаў і калекцый краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў; гісторыка-краязнаўчыя даследаванні (гісторыя краязнаўчай дзейнасці, гісторыя бібліятэк і кніжнай справы ў вобласці) і інш.

Абласныя бібліятэкі ўдзельнічаюць таксама ў даследаваннях па гісторыі самой вобласці, яе асобных тэрыторый і населеных месц, па абласной біяграфіцы і генеалогіі і г.д. Да ліку важных відаў навукова-даследчай работы адносіцца падрыхтоўка навукова-дапаможнай бібліяграфічнай прадукцыі.

Навукова-даследчая дзейнасць публічных бібліятэк у галіне краязнаўства мае практычную скіраванасць і абапіраецца на тыя крыніцы, якія збіраюцца, ствараюцца самой бібліятэкай або да якіх яна мае доступ. Да асноўных тэматычных напрамкаў адносяцца: гісторыя населеных пунктаў, змены адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення; мясцовыя тапонімы; хронікі падзей; гісторыя ўстаноў і прадпрыемстваў; біяграфічныя звесткі пра дзеячаў края; генеалогія і гісторыя сем’яў; помнікі прыроды, архітэктуры, гісторыі і культуры; мясцовы фальклор, промыслы і рамёствы, абрады і звычаі мясцовага насельніцтва; гісторыя і змест найбольш значных краязнаўчых выданняў і інш.

Вынікі навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк прадстаўляюцца ў выглядзе дакладаў і паведамленняў на навукова-практычных канферэнцыях, чытаннях, семінарах, публікуюцца як асобна, так і ў прафесійных друкаваных і электронных выданнях, а таксама размяшчаюцца ў інтэрнэце.

Навукова-даследчая дзейнасць ПБ цесна звязана з практычнымі задачамі фарміравання краязнаўчых рэсурсаў і абслугоўвання чытачоў і накіравана галоўным чынам на папаўненне краязнаўчых рэсурсаў, раскрыццё іх складу і магчымасцяў; павышэнне дакладнасці і дакладнасці назапашваемых і распаўсюджваюцца краязнаўчых ведаў; пашырэнне і павышэнне надзейнасці фактаграфічнай краязнаўчай інфармацыі, павышэнне ўзроўню краязнаўчай кваліфікацыі супрацоўнікаў.

Навукова-даследчая дзейнасць ПБ мае пераважна фактаграфічную накіраванасць і абапіраецца на першасныя крыніцы, якія збіраюцца або ствараюцца самой бібліятэкай.

Да асноўных тэматычных напрамкаў, па якіх праводзяцца даследаванні, адносяцца:

- гісторыя змены межаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення тэрыторыі; даты стварэння і змянення статусу або адміністрацыйна-тэрытарыяльнай падпарадкаванасці населеных пунктаў;
- мясцовыя тапонімы;
- хроніка асноўных падзей;
- генеалогія і гісторыя сем'яў;
- гісторыя ўстаноў і прадпрыемстваў;
- біяграфічныя звесткі аб ураджэнцах і жыхарах;
- помнікі архітэктуры, гісторыі і культуры;
- помнікі прыроды;
- мясцовыя промыслы і рамёствы, абрады і звычаі мясцовага насельніцтва;
- мясцовы фальклор.

Важнымі напрамкамі навукова-даследчай дзейнасці ПБ з'яўляюцца таксама:

- вывучэнне кніжных фондаў і калекцый краязнаўчых дакументаў;
- вывучэнне гісторыі і зместу найбольш значных краязнаўчых выданняў;
- гісторыка-краязнаўчыя даследаванні (гісторыя краязнаўчай дзейнасці; гісторыя бібліятэк і кніжнай справы).

ПБ вядзе краязнаўчую навукова-даследчую дзейнасць у супрацоўніцтве і каардынацыі з іншымі ўстановамі і арганізацыямі, якія займаюцца вывучэннем тэрыторыі (музеямі, архівамі, інспекцыямі і аддзеламі па ахове аб'ектаў культурнай спадчыны, краязнаўчымі таварыствамі і інш.), выдавецтвамі - па магчымасці ў рамках мясцовых і рэгіён праграм.

Метадычнае кіраўніцтва краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк краіны ажыццяўляе Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Гэту задачу выконваюць розныя структурныя падраздзяленні бібліятэкі ў межах сваіх паўнамоцтваў.

У структуры навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі функцыянуе спецыялізаванае падраздзяленне – сектар краязнаўства і праектнай работы. Асноўнымі яго задачамі як метадычнага цэнтра з’яўляюцца: аналіз краязнаўчай дзейнасці рэгіянальных бібліятэк; распрацоўка рэгламентуючых дакументаў і метадычных дапаможнікаў па краязнаўчай бібліяграфіі; падрыхтоўка аглядаў краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі рэгіянальных бібліятэк; удзел у стварэнні краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі; кансультацыйная дапамога рэгіянальным бібліятэкам; правядзенне семінараў, канферэнцый, круглых сталоў па пытаннях бібліятэчнага краязнаўства.

Метадычнае кіраўніцтва краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк вобласці ажыццяўляе абласная бібліятэка. Яна адказвае за стан краязнаўчай дзейнасці публічных бібліятэк і ў пэўнай ступені іншых бібліятэк рэгіёна, незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці. Цэнтральная раённая бібліятэка аказвае метадычную, інфармацыйную і кансультацыйную дапамогу бібліятэкам ЦБС.

У якасці метадычнага цэнтра абласная бібліятэка:

вывучае стан краязнаўчай дзейнасці бібліятэк вобласці па ўсіх кірунках;

рыхтуе метадычныя матэрыялы ў дапамогу краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці, агляды практычнага вопыту, аналітычныя справаздачы і даведкі;

аказвае кансультацыйную і метадычную дапамогу, спрыяе ўкараненню ў бібліятэках рацыянальных і эфектыўных форм і метадаў працы;

арганізуе павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў краязнаўчых падраздзяленняў бібліятэк вобласці: праводзіць адукацыйныя семінары, практыкумы, школы перадавога вопыту, стажыроўкі і інш.;

садзейнічае прафесійным зносінам спецыялістаў шляхам арганізацыі семінараў, канферэнцый, круглых сталоў і г.д.

Цэнтральная ПБ з'яўляецца метадычным цэнтрам для бібліятэк сваёй тэрыторыі ў галіне краязнаўчай дзейнасці. У гэтай якасці яна:

- аналізуе стан гэтай дзейнасці ў бібліятэках;
- рыхтуе і публікуе метадычныя і методыка-бібліяграфічныя матэрыялы, агляды практычнага вопыту, аналітычныя справаздачы і даведкі;
- аказвае кансультацыйную і метадычную дапамогу па канкрэтных пытаннях;
- арганізуе павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк па пытаннях бібліятэчнага краязнаўства, арганізацыі, зместу і метадам краязнаўчых даследаванняў: творчыя лабараторыі, школы перадавога вопыту, праводзіць навучальныя семінары, практыкумы, групавыя і індывідуальныя стажыроўкі і інш.

У якасці пляцоўкі для метадычнай работы цэнтральная ПБ стварае і падтрымлівае на сваім сайце (у яго прафесійнай частцы) самастойны раздзел, прызначаны спецыялістам у галіне бібліятэчнага краязнаўства.

## Тэма 2.4 Матэрыяльна-тэхнічная база дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству

Паняцце “матэрыяльна-тэхнічная база” (МТБ) як неад'емны элемент пры ажыццяўленні сістэмнага аналізу бібліятэкі даследавана ў работах Ю.М. Сталярова. Некаторыя праблемы ўплыву МТБ на арганізацыю працы бібліёграфа разгледжаны ў работах І.Р. Маргенштэрна.

У краязнаўчым аспекце даследавана выкарыстанне матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэкі ў Кушнарэнка Н.М.

Сомава Т.М. адзначала, што праектаванне і ўзвядзенне будынка і памяшканняў дзіцячай бібліятэкі патрабуюць уліку мясцовых асаблівасцей і традыцый. У вонкавым і ўнутраным абліччы дзіцячай бібліятэкі павінен прысутнічаць краязнаўчы каларыт.

Краязнаўчы аспект паняцця “матэрыяльна-тэхнічная база” на прыкладзе ўніверсальных навуковых і іншых бібліятэк патрабуе далейшага вывучэння.

## Тэма 2.5 Краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства

Бібліятэчнае краязнаўства разглядаецца (Л.Г. Тараненка і інш.) як міждысцыплінарны навуковага напрамак, які ўключае бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. На сучасным этапе стан і ступень распрацаванасці асноўных тэарэтычных аспектаў бібліятэчнага краязнаўства не адпавядаюць у поўнай меры патрабаванням сучаснага ўзроўню развіцця краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Даследаванні вапросаў бібліятэчнага краязнаўства ў большай ступені з'яўляюцца прыкладнымі [2 ; 26].

Краязнаўчае бібліятэказнаўства, як тэарэтычнае ядро бібліятэчнага краязнаўства, прадстаўляе сабой сістэму ведаў аб мясцовай публічнай бібліятэцы, аб прынцыпах, законах і законамернасцях практычнай краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, накіраванай на збор, захаванне і прадстаўленне ў грамадскае карыстанне краязнаўчых дакументаў, а таксама інфармацыі аб іх. Прадмет краязнаўчага бібліятэказнаўства – бібліятэка як суб’ект і аб’ект краязнаўчай дзейнасці.

Краязнаўчае бібліяграфазнаўства адна са складаючых бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Прадметам гэтай навукі з'яўляецца краязнаўчая бібліяграфія як від, яе функцыянальныя, тэарэтычныя, арганізацыйныя і метадычныя асаблівасці. У межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць непарыўна звязана з задачамі, функцыямі, кірункамі дзейнасці бібліятэк і спрыяе іх эфектыўнай рэалізацыі. Бібліяграфічнымі сродкамі ў бібліятэках ствараюцца інфармацыйна-пошукавыя сістэмы па краязнаўстве, якія забяспечваюць карыстальнікам зручны доступ да краязнаўчых дакументаў і ведаў. Краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі і метады, са свайго боку, актыўна ўплываюць на бібліятэчныя формы краязнаўчай работы і спажыўцоў інфармацыі.

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Матэрыялы для правядзення круглых сталоў, дзелавых гульняў

### Круглы стол

**Тэма 1.2 Асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству** (2 гадзіны)

***Сучасны стан тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству.***

*Мэта:* вызначэнне **сучаснага стану тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству.**

*Задачы:*

выявіць, прааналізаваць інфармацыю і вызначыць асаблівасць будынка вывучэння мясцовай публічнай бібліятэкі (месца працы слухача). як матэрыяльнага аб’екта краю і помніка мясцовай гісторыі і культуры;

вызначыць магчымасці архітэктурна-планіровачнага і тэхналагічнага аблічча, інтэр’ера мясцовай публічнай бібліятэкі (месца працы слухача). як сродка краязнаўчага ўздзеяння;

вызначыць асноўныя і дадатковыя крыніцы фінансавання краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі (месца працы слухача).

*Парадак узаемадзеяння*:

1. Адкрыццё круглага стала.
2. Прэзентацыя тэмы, мэты і задач круглага стала.
3. Прэзентацыя пытанняў круглага стала.
4. Абмеркаванне пытанняў круглага стала.
5. Абагульненне вынікаў круглага стала.

*Пытанні для абмеркавання:*

1. Тэарэтычныя праблемы вызначэння асноўных паняццяў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
2. Інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна: структура, спецыфіка.
3. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці.
4. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Беларусі.
5. Прааналізаваць арганізацыю краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі (месца працы слухача).

## Дзелавая гульня

**Тэма 2.2 Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству** (2 гадзіны)

***Спецыфіка выканання запытаў карыстальнікаў краязнаўчага характару пры даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні.***

Сцэнарый

*Мэта і задача:* фарміраванне ведаў спецыфікі запытаў карыстальнікаў краязнаўчага характару і прафесійных уменняў у слухачоў;

ажыццяўленне выканання запытаў карыстальнікаў краязнаўчага характару пры даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні.

*Працягласць* – 2 акадэмічныя гадзіны.

*Колькасць удзельнікаў* – група з 25–30 слухачоў.

*Парадак правядзення*:

Слухачы дзеляцца па парах, у якіх кожны выконвае ролю “бібліёграфа-краязнаўцы” і “карыстальніка”. Вызначыць рэгіён, у адносінах да якога будзе ажыццяўляцца даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне, тэму для кожнага віду запыту, крыніцы пошуку інфармацыі, аформіць даведку.

*Этапы правядзення*:

Уводзіны: прэзентацыя тэмы, мэты і задання.

Асноўная частка:

стварэнне спрыяльнай атмасферы для дыялогу;

падбор заданняў: вызначэнне рэгіёнаў, тэм; тэхналогіі выканання розных відаў запытаў; крыніц пошуку інфармацы; пытанні слухачоў для ўдакладнення; аналіз атрыманых даведак.

Заданні:

1. Вызначыць рэгіён, у адносінах да якога будзе ажыццяўляцца даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне.
2. Слухачу-“карыстальніку” сфармуляваць бібліяграфічныя запыты краязнаўчага зместу розных відаў па пошуку краязнаўчых, мясцовых дакументаў: адрасны, тэматычны, удакладняючы, фактаграфічны з магчымасцю прадастаўлення першакрыніцы.
3. Слухачу-“бібліёграфу-краязнаўцу” выканаць даныя запыты па краязнаўству з выкарыстаннем электронных інфармацыйных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: электронны каталог, зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі, рэгіянальны зводны каталог бібліятэк пэўнай вобласці Беларусі, нацыянальная бібліяграфія Беларусі, “Нацыянальная база даных аўтарытэтных/ нарматыўных запісаў”, БД “Беларусь: ад мінулага да сучаснага”, БД “Беларусь у асобах і падзеях”, ліцэнзійныя базы даных Віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (па-магчымасці), іншых крыніц інфармацыі.

4. Вынікі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання занесці ў табліцу.

| Запыт | Удакладненне запыту (пры неабходнасці) | Даведка (БА дакументаў) | Крыніцы пошуку інфармацыі | Пуць пошуку |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

*Заключная частка*: абагульненне і падвядзенне вынікаў.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Пытанні для бягучай атэстацыі слухачоў

### Пытанні для правядзення заліку па дысцыпліне "Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства"


### Пытанні для правядзення заліку па дысцыпліне "Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства"


1. Краязнаўства як грамадская з'ява.
2. Узнікненне і развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства Беларусі.
3. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: змест, спецыфіка, арганізацыя, прамоцыя.
4. Тэарэтычныя праблемы вызначэння асноўных паняццяў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
5. Краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Беларусі.
6. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці.
7. Спецыфіка краязнаўчага фонда бібліятэкі.
8. Асаблівасць тэхналагічных этапаў фарміравання краязнаўчага фонду бібліятэкі.
9. Фонд мясцовых документаў.
10. Асаблівасці фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэк розных тыпаў.
11. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі.
12. Краязнаўчыя каталогі, форма прадстаўлення.
13. Краязнаўчыя картатэкі і базы даных (БД) .
14. Каталогі мясцовых дакументаў: прызначэнне, аб'екты адлюстравання, структура.
15. Рэгіянальныя зводныя каталогі бібліятэк Беларусі (РЗЭК).
16. Фактаграфічныя краязнаўчыя базы даных.
17. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі.
18. Фонд неапублікаваных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
19. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўчага, аналітычнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
20. Метадычныя асаблівасці сінтэтычнага, заключнага этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
21. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых дапаможнікаў.

22. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў навукова-дапаможных краязнаўчых дапаможнікаў.

23. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўцы фактаграфічных інфармацыйных прадуктаў.

24. Класіфікацыя краязнаўчых электронных інфармацыйных прадуктаў.

25. Краязнаўчыя электронныя інфармацыйныя прадукты: асаблівасці стварэння.

26. Краязнаўчая інфармацыя на вэб-сайтах бібліятэк.

27. Якасць электронных краязнаўчых прадуктаў.

28. Асаблівасць індывідуальнага, групавога (калектыўнага) бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве.

29. Спецыфіка франтальнага (масавага) бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве.

30. Навукова-даследчая і навукова-метадычная дзейнасць бібліятэкі па краязнаўстве.

31. Матэрыяльна-тэхнічная база дзейнасці бібліятэкі па краязнаўстве.

## 4.2 Заданні для самастойнай работы

### Раздзел 1 Асновы тэорыі і арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі

#### Тэма 1.1 Краязнаўства як грамадская з'ява

*Заданне* (2 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Краязнаўства як грамадская з'ява: змест, формы арганізацыі, задачы, тэарэтычныя пытанні.
2. Рэгіёны Беларусі як аб'екты вывучэння краязнаўства.
3. Асноўныя этапы развіцця краязнаўства Беларусі.
4. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: паняцце, мэта, задачы.

краязнаўства Беларусі.

5. Узнікненне і развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства Беларусі.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [2; 25; 29; 31; 32].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 1 –4).

#### Тэма 1.2 Асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству

*Заданне* (2 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Тэарэтычныя праблемы вызначэння асноўных паняццяў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
2. Інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна: структура, спецыфіка.
3. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці.
4. Нарматыўнае рэгуляванне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Беларусі. Кіраванне краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк.
5. Назавіце формы, якія выкарыстоўваюцца Вашай бібліятэкай (месца працы слухача) для вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі па краязнаўству.
6. Вызначыць сацыяльна-эканамічны профіль рэгіёна (для бібліятэкі–месца працы слухача).
7. Назавіце катэгорыі карыстальнікаў інфармацыі па краязнаўству Вашай бібліятэкі (месца працы слухача).

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [2; 25–33].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанне № 4–6).

## Раздзел 2 Асноўныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк

### Тэма 2.1 Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўству

*Заданне* (4 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Спецыфіка фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў.
2. Асаблівасці арганізацыі фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэкі.
3. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі.
4. Краязнаўчыя электронныя прадукты: асаблівасць, класіфікацыя, якасць.
5. Спецыфіка асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўцы краязнаўчых прадуктаў.
6. Тэст для самаправеркі слухачоў

1. Краязнаўчы фонд, гэта – ______________________________________

2. Распалажыце ў парадку супадчынення наступныя тэрміны:

**2.1.** Адзіны (сукупны) краязнаўчы фонд краіны

**2.2.** Фонд краязнаўчых дакументаў

**2.3.** Падфонд краязнаўчых дакументаў

**2.4.** Сукупны краязнаўчы фонд края

**3.** Адзначце правільны адказ:

Асноўнай характарыстыкай краязнаўчага фонда з’яўляецца:

**3.1.** Велічыня

**3.2.** Паўната

**3.3.** Аб’ём

**4.** Дапоўніце сказ:

Краязнаўчыя дакументы захоўваюцца ў фондзе незалежна ад года выдання і ______________спісанню як састарэлыя па зместу.

**5.** Адзначце правільны адказ:

Спецыфіка фарміравання краязнаўчых фондаў залежыць ад:

**5.1.** Склада кантынгента карыстальнікаў і іх інфармацыйных патрэбнасцей

**5.2.** Сацыяльна-эканамічнага і культурнага профілю рэгіёна

**5.3.** Камплектатара

**5.4.** іншае________

**6.** “Інфармацыйныя патрэбы рэгіёна” і “рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбы”: якое паняцце шырэйшае за другое?

**7.** Назавіце метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў______________________________________________

**8.** Назавіце фактары, якія вызначаюць профіль інфармацыйных патрэбнасцей рэгіёна______________________________________________

**9.** Дапоўніце сказ:

Дэпазітарыямі краязнаўчых і мясцовых дакументаў з'яўляюцца _____________ бібліятэкі.

**10.** Адзначце правільны адказ:

Найбольш шырокія па складу і глыбокія па паўнаце краязнаўчыя фонды збіраюцца ў:

**10.1.** публічных масавых бібліятэках ;

**10.2.** абласных бібліятэках;

**10.3.** спецыяльных бібліятэках.

**11.** Назавіце тры групы краязнаўчых дакументаў, якія характаразуюць сукупны краязнаўчы фонд рэгіёна:____________________________________

**12.** Назавіце магчымыя віды арганізацыі краязнаўчага фонда бібліятэк:_____________________________________________________

**13.** У якіх параметрах дазваляюць мадэліраваць фонд бібліятэкі асаблівасці краязнаўчых дакументаў?

**14.** Назавіце віды камплектавання фонда краязнаўчых і мясцовых дакументаў _______________________________________ .

**15.** Выбярыце спосабы папаўнення фонда краязнаўчых і мясцовых дакументаў і укажыце від камплектавання, якому яны адпаведаюць:

| Спосабы папаўнення фонда краязнаўчых і мясцовых дакументаў | Від камплектавання |
|---|---|
| Абавязковы бясплатны экземпляр дакументаў<br>Падпіска<br>Пакупка<br>Кнігаабмен<br>Репрадуцыпаванне, капіраванне<br>Дар<br>Замена страчаных дакументаў<br>Іншае | |

**16.** Пералічыце крыніцы папаўнення фонда краязнаўчых і мясцовых дакументаў______________________________________________

______________________________________________

**17.** Дапоўніце сказ:

Краязнаўчая каштоўнасць дакумента – гэта ______________________

______________________________________________________

**18.** Якія дакументы складаюць ядро краязнаўчага фонду?

______________________________________________________

**19.** У чым значнасць абавязковага бясплатнага экземпляра выданняў, якія выпускаюцца арганізацыямі вобласці?________________________

______________________________________________________

**20.** Якія віды дакументаў уваходзяць у склад абавязковага бясплатнага экземпляра выданняў арганізацый вобласці, які атрымліваюць абласныя бібліятэкі Рэспублікі Беларусь? Пазначце правільны адказ:

**20.1.** Неперыядычныя выданні

**20.2.** Перыядычныя выданні

**20.3.** Электронныя выданні

**20.4.** Камбінаваныя выданні

**20.5.** Выданні для інвалідаў па зроку і слабавідячых

**20.6.** Картаграфічныя выданні

**20.7.** Неапублікаваныя дакументы

**20.8.** Выданні па інтэлектуальнай уласнасці

**21.** Якая бібліятэка ажыццяўляе дэпазітарнае захоўванне краязнаўчых і мясцовых дакументаў?

**21.1.** Нацыянальная бібліятэка Беларусі

**21.2.** Цэнтральная бібліятэка бібліятэчнай сістэмы

**21.3.** Абласная бібліятэка

**21.4.** Іншая _______________________

**22.** У якім выпадку ў бібліятэках ажыццяўляецца абасоблены сумарны (інтэгрыраваны) улік краязнаўчых і мясцовых дакументаў?-

______________________________________________________

**23.** Суаднясіце адпаведные краязнаўчыя фонды (КФ) (віды і іх падвіды), якія выдзяляюцца па функцыянальным прызначэнні

| Від краязнаўчых фондаў (КФ) | Падвіды краязнаўчых фондаў (КФ) |
|---|---|
| Запасныя | Асноўныя, дапаможныя |
| Дзейнічаючыя | Аператыўныя, дэпазітарныя |
| Чытацкі | Рэзервовыя, страхавыя |
| Аператыўныя | Чытацкія, службовыя |

**24.** Якія класіфікацыі выкарыстоўвываюцца пры растаноўцы краязнаўчых фондаў у публічных бібліятэках?

20.1. ББК. Табліцы для краязнаўчых каталогаў бібліятэк

20.2. ББК. Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя: рабочыя табліцы для масавых бібліятэк

20.3. Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь

20.4. УДК

20.5. ДРНТІ.

8. Тэст "Індэксаванне краязнаўчых дакументаў" для самаправеркі слухачоў

**1**. Дапоўніце сказ

У склад бібліяграфічнага запісу ўваходзяць бібліяграфічнае апісанне, якое па меры неабходнасці дапаўняецца … , даведкамі аб дадатковых бібліяграфічных запісах, датай завяршэння апрацоўкі дакумента, звесткамі службовага характару.

**2**. Адзначце правільны(ыя) адказ(ы)

Раскрыццё краязнаўчых матэрыялаў ажыццяўляецца з дапамогай аналітычнага апісання, а таксама аднаго з яго элементаў:

– "Змест"
– "Са зместу"
– "Рэц. на арт."

**3.** Дапоўніце сказ

Індэксаванне – передача зместу дакумента і/альбо сэнсу інфармацыйнага запыту на … .

**4.** Дапоўніце сказ

Даведачны фонд працоўнага месца індэксатара складаецца з … .

**5.** Адзначце правільны(ыя) адказ(ы)

Асноўныя стандарты, якія рэгламентуюць індэксаванне:

– ГОСТ 7.59–2003
– ГОСТ 7.66–1992
– ГОСТ 7.1–2003
– ГОСТ 83–2001
– ГОСТ 7.74–1996

**6.** Дапоўніце сказ

Абъектам индэксавання з'яўляецца асобны …, яго … альбо … .

**7.** Дапоўніце сказ

Індэксаванне складаецца з наступных узаемазвязаных этапаў:

– аналіз зместу … як аб'екта індэксаваня
– … сэнсавых кампанентаў ў змесце дакумента
– прынядце … аб складзе пошукавага вобраза дакумента (ПВД) –
– афармленне адабраных сэнсавых кампанентаў як … у тэрмінах індэксаванняу адпаведнасці з сістэмай граматычных сродкаў данай … .
– … тэрмінаў індэксавання ў складзе ПВД.
– **8.** Суаднясіце назву тэрміна і яго вызначэнне

| | |
|---|---|
| Прадметнае індэксаванне | Прысваенне даным альбо дакументам класіфікацыйных індэксаў у адпаведнасці з правіламі якой-небудзь класіфікацыйнай ІПМ |

| | |
|---|---|
| Класіфікацыйнае індэксаванне | Індэксаванне, якое прадугледжвае шматаспектнае адлюстраванне асноўнага сэнсавага зместу інфармацыйнага запыту мноствам ключавых слоў альбо дэскрыптараў. |
| Каардынатнае індэксаванне | Індэксаванне прадметнага зместу дакументаў |

**9**. Што аб’ядноўвае прынцып адэкватнасці і прынцып уніфікаваных загалоўкаў?

**10.** Алгарытм прадметызацыі краязнаўчых дакументаў.

Распалажыце ў адпаведнай паслядоўнасці:

1. Выявіць прадмет(ы) дакумента.
2. Упарадкаваць сінтагматычныя адносіны паміж лексічнымі адзінкамі (выстраіць іх у ланцужок) у складзе складанай прадметнай рубрыкі, якая утварылася ў адпаведнасці з прадметызацыйнай формулай).
3. Аформіць прадметызацыйнае рашэнне, зафіксаваць яго ў бібліяграфічным запісу дакумента па правілам, з адначасовым афармленем запісу ў спіс ПР.
4. Выкрэсліць аспекты разгляду прадмета.
5. Зафіксаваць парадыгматычныя адносіны паміж лексічнымі адзінкамі ў ПР з дапамогай спасылачна-даведачнага апарату ў спісе ПР.
6. Вывучыць змест дакумента.
7. Прыняць прадметызацыйнае рашэнне, выразіць яго адной ці некалькамі адэкватнымі прадметнымі рубрыкамі (ПР), якія складаюць пошукавы вобраз дакумента (ПВД).

**11.** Ці згодны Вы со сцвярджэннем (Так/Не)

У склад прадметных рубрык могут уваходзіць усе часткі рэчы, аднак асноўнай моўнай формай выражэння паняццяў у прадметнай рубрыце з’яўляецца прыметнік. Наяўнасць назоўніка ў прадметнай рубрыцы неабавязкова.

**12.** Дапоўніце сказ

Прадметызацыйная інфармацыйна-пошукавая мова – інфармацыйна-пошукавая мова, якая прадназначана для … дакументаў (частак документаў) і інфармацыйных запытаў пры дапамозе … .

**13.** Алгарытм сістэматызацыі краязнаўчага дакумента.

Распалажыце ў адпаведнай паслядоўнасці:

1. Прынящце класіфікацыйнага рашэння (на аснове прымянення правіл агульнай і прыватнай методык сістэматызацыі).
2. Рэдагаванне індэкса і прадметнай рубрыкі (ПР) алфавітна-прадметнага паказальыка (АПП).
3. Выяўленне асноўных класіфікацыйных прымет: тэма, праблемы, аспекты (у тым ліку рэгіянальны аспект).
4. Пры неабходнасці (метад паўторнага адлюстравання), напісанне (складанне) дадатковай карткі.

5. Прастаўленне індэксаў на картках і дакуменце.

6. Пераўтварэнне класіфікацыйнага рашэння ў класіфікацыйныя індэксы. Напісанне састаўнога індэкса.

**14.** Дапоўніце сказ

Класіфікацыйная інфармацыйна-пошукавая мова – інфармацыйна-пошукавая мова, якая прадназначана для …    дакументаў (частак документаў) і інфармацыйных запытаў пры дапамозе …   .

**15.** Адзначце правільны(ыя) адказ(ы)

Пры сістэматызацыі краязнаўчага дакумента выкарыстоўваюцца наступныя класіфікацыйныя сістэмы:

1. Государственный рубрикатор научно-технической информации (ГРНТИ)   (Москва, 2007)
2. Эталонная версия ГРНТИ [Электронный ресурс]
3. Библиотечно-библиографическая классификация. Таблицы для краеведческих каталогов библиотек (Москва, 1989)
 (Мінск, 2016)
4. Універсальная дзесятковая класіфікацыя (Мінск, 2016)
5. Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь (Мінск, 1994)
6. Машыначытальная версія ББК (БД ББК)
7. Универсальная десятичная классификация: сокращенное издание (Москва, 2012)
8. Библиотечно-библиографическая классификация : средние таблицы. Вып. 1 – 8 (Москва, 2001–2019)
9. Библиотечно-библиографическая классификация : [ББК] : сокращенные таблицы (Москва, 2021)
10. Машыначытальная версія УДК (БД УДК)
11. Універсальная дзесятковая класіфікацыя  (Мінск, 2016)

**16.** Дапоўніце сказ

У працэссе сістэматызацыі ў выпадку, калі для адлюстравання дакумента недастаткова аднаго індэкса, выкарыстоўваецца магчымасць класіфікацыйнай сістэмы складання … класіфікацыйных індэксаў на адзін дакумент. У гэтым выпадку выкарыстоўваецца метад …   .

**17.** Дапоўніце сказ

Класіфкацыйнае рашэнне выражают аднім альбо …   , якія складаюць пошукавы вобраз дакумента ў выглядзе …   дакумента.

**18**. Ці згодны Вы со сцвярджэннем (Так/Не).

Рэзультатам сістэматызацыі з’яўляецца шыфр захоўвання дакумента, які дазваляе месца дакумента ў сістэме галін ведаў, якія адлюстраваны ў фондзе альбо ІПС.

**19.** Суаднясіце назву тэрміна і яго вызначэнне

| | |
|---|---|
| ключавое слова | Лексічная адзінка, якая выражана |

| | |
|---|---|
| | інфарматыўным словам (вербальна) альбо кодам і з’яўляецца імем класа сінанімічных альбо блізкіх па сэнсу ключавых слоў |
| дескрыптар | Інфарматыўнае слова, якое прыведзена да стандартнай лексіграфічнай формы і выкарыстоўваецца для каардынатнага індэксавання |

**20**. Дапоўніце сказ:

Інфармацыйна-пошукавы тэзаўрус, ІПТ: … слоўнік дескрыптарнай інфармацыйна-пошукавай мовы с зафіксаванымі ў ім парадыгматычнымі адносінамі лексічных адзінак.

**21.** Алгарытм складання ключавых слоў. Распалажыце ў адпаведнай паслядоўнасці:

1. Запісаць ключавыя словы на картку і ўлажыць ў дакумент дл я ўвода ў ЭК.
2. Вывучыць дакумент (тытульны ліст, анатацыю, рэферат, змест, тэкст, класіфікацыйны індэкс, калі ёсць)
3. Адрэдагаваць ключавыя словы.
4. Выбраць з пошукавай анатацыі ключавыя словы, нармалізаваці іх.
5. Скласці пошукавую анатацыю з ключавых слоў, якія адлюстроўваюць змест дакумента, якая фарміруе пошукавы вобраз дакумента (яго прадмет, аспекты тэмы).

**22**. Дапоўніце сказ

Індэксатар – гэта … .

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [1; 2; 7; 5; 7; 9; 10; 13; 14; 16; 19; 22–25].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 7 –27).

**Тэма 2.2 Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству**

*Заданне* (2 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Індывідуальнае, групавое (калектыўнае) бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве.

2. Франтальнае (масавае) бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве

3. Краязнаўчы кампанент фарміравання медыйна-інфармацыйнай пісьменнасці і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў.

4. Прааналізаваць віды і формы бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі (месца працы слухача) па краязнаўстве.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [1; 2; 3; 6; 8; 11; 15; 17; 18; 21; 29; 31–33].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанне № 28–30).

**Тэма 2.3 Навукова-метадычная і навукова-даследчая дзейнасць бібліятэкі па краязнаўству**

*Заданне* (2 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці па краязнаўстве ў бібліятэках. Напрамкі навуковых даследаванняў.

2. Арганізацыя, сучасныя формы навукова-метадычнай дзейнасці па краязнаўстве ў бібліятэках.

3. Даць характарыстыку асноўным напрамкам навукова-даследчай дзейнасці па краязнаўстве Вашай бібліятэкі (месца працы слухача).

4. Даць характарыстыку асноўным напрамкам навукова-метадычнай дзейнасці па краязнаўстве Вашай бібліятэкі (месца працы слухача).

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [2; 15; 19; 20; 25; 28; 29; 31–33].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 2; 3; 5; 30).

**Тэма 2.4 Матэрыяльна-тэхнічная база дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству**

*Заданне* (2 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Мясцовая публічная бібліятэка як прадмет бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства і помнік мясцовай гісторыі і культуры.

2. Архітэктурна-планіровачнае і тэхналагічнае аблічча, інтэр'ер мясцовай публічнай бібліятэкі як сродак краязнаўчага ўздзеяння на карыстальнікаў.

3. Даць характарыстыку будынку Вашай бібліятэкі (месца працы слухача) як аб'екту краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

4. Як выкарыстоўваецца асаблівасць будынка Вашай бібліятэкі (месца працы слухача), яго інтэр'ер для краязнаўчага ўздзеяння на карыстальнікаў бібліятэкі?

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [2; 15; 19; 20; 25; 28; 29; 31–33].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.*
Падрыхтаваць матэрыялы, неабходныя для абмеркавання на круглым стале. Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 3; 31).

**Тэма 2.5 Краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства**

*Заданне* (2 гадзіны)

Вывучыць з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры наступныя пытанні:

1. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства (бібліятэчнае краязнаўства) як міждысцыплінарны навуковы напрамак, які спалучае бібліятэказнаўчыя, бібліяграфазнаўчыя, кнігазнаўчыя аспекты вывучэння краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
2. Кампанентная структура бібліятэчнага краязнаўства.
3. Цэнтры краязнаўчага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства.
4. Асноўныя накірункі навуковых даследаванняў. Айчынныя і замежныя даследчыкі ў галіне бібліятэчнага краязнаўства.
5. Прааналізаваць рэгіянальны цэнтр краязнаўчага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства (рэгіён – месца працы слухача).

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [2; 15; 19; 20; 25; 28; 29; 31–33].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Падрыхтаваць матэрыялы, неабходныя для абмеркавання на круглым стале. Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 3; 32).

## 4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды / досыць поўныя і сістэматызаваныя веды / дастатковыя веды па ўсіх раздзелах курсу, а таксама дастатковы аб'ём ведаў па курсу ў рамках адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці перападрыхтоўкі, выкарыстанне адпаведнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны адказ на пытанні, поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры/ засваенне рэкамендуемай асноўнай літаратуры па курсу, уменне свабодна, выразна арыентавацца ў тэорыі і даваць аналітычную / параўнальную ацэнку, актыўны, творчы, дастаткова пастаянны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі / дастатковы / дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў, уменне/імкненне ставіць глыбокія, праблемныя пытанні, рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні/высновы без істотных памылак |
| не залічана | Недастаткова поўны аб'ём ведаў, фрагментарныя веды або адсутнасць ведаў па курсу ў рамках адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці перападрыхтоўкі, няўменне выкарыстоўваць неабходную тэрміналогію, веданне толькі асобных рэкамендуемых літаратурных крыніц, пераказ адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі, няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, пасіўны ўдзел у групавых абмеркаваннях, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў, адмова ад адказу |

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Вучэбная праграма

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
. .2022
Рэг. № ВД- Пп/эвуч.

**ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА**

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія,
кваліфікацыя: бібліятэкар-бібліёграф,
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
28.09.2020 № 260, рэг. № 25-13/126

Мінск, 2022

Распрацоўшчык праграмы:
А.В. Прадзеіна, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук

Рэкамендавана да зацвярджэння:

кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад 07.06.2022 № 33

Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад 14.06.2022 № 6

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад 15.06.2022 № 5

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” прадугледжвае рэалізацыю патрабаванняў, якія ўстаноўлены Адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 2-23 02 71 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.09.2020 № 259.

Для вывучэння дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” прадугледжана 30 вучэбных гадзін, якія ўключаюць 14 вучэбных гадзін аўдыторных заняткаў (у тым ліку: 6 вучэбных гадзін лекцый, 2 вучэбныя гадзіны – круглы стал, 2 вучэбныя гадзіны – дзелавая гульня); 16 вучэбных гадзін самастойнай работы.

Дысцыпліна “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” адносіцца да кампанента тыпавога вучэбнага плана “Агульнапрафесійныя дысцыпліны” і вывучаецца ва ўзаемасувязі з дысцыплінамі “Дакументазнаўства”, “Бібліяграфазнаўства”, “Бібліятэказнаўства”, “Бібліятэчны фонд”, “Каталагізацыя дакументаў”, “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы”, “Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў”, “Асновы інфармацыйных тэхналогій”.

**Актуальнасць** вучэбнай праграмы абумоўлена неабходнасцю набыцця кампетэнцый па ажыццяўленню краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

**Мэта:** садзейнічанне засваенню: тэарэтычных асноў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства**;** паняцця, зместу і спецыфікі ажыццяўлення краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, як у традыцыйным, так і электронным асяроддзі.

**Задачы**:

засваенне слухачамі тэарэтычных пытанняў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

разгляд арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

раскрыццё асаблівасцей ажыццяўлення дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве.

**Метады навучання**: традыцыйныя (метады арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады стымуліравання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады кантроля і самакантроля); актыўныя; інтэрактыўныя.

**Сродкі навучання**: аўдыяльныя, візуальныя, аўдыявізуальныя.

**Формы вучэбных заняткаў:** лекцыі, круглы стол, дзелавая гульня.

**Форма атрымання адукацыі:** завочная.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў.**

У выніку засваення дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” ў слухача павінны быць сфарміраваны сацыяльна-асобасныя, акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі.

*Патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць ідэалогію беларускай дзяржавы, маральныя і прававыя нормы, умець улічваць іх у сваёй прафесійнай дзейнасці;

умець арыентавацца ў працэсах і тэндэнцыях развіцця сучаснага грамадства.

*Патрабаванні да фармавання акадэмічных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць асаблівасці функцыянавання ў грамадстве дакументаў як носьбітаў сацыяльнай інфармацыі;

ведаць базавыя тэарэтычныя веды ў галіне дакументазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, умець прымяняць іх для вырашэння практычных і навуковых задач бібліятэчнай сферы

ведаць тэарэтычныя асновы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

ведаць спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці па краязнаўстве.

*Патрабаванні да фармавання прафесійных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць змест, формы арганізацыі, задачы краязнаўства як грамадскай з'явы;

ведаць паняцце, мэту, задачы краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

ведаць **асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству;**

**ведаць групы к**арыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці ў краязнаўчай інфаомацыі;

**ведаць віды крыніц краязнаўчай інфармацыі;**

**ведаць інфармацыйныя рэсурсы па краязнаўству, тэхналогію іх фарміравання;**

**ведаць віды б**ібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству, тэхналогію іх рэалізацыі;

**ведаць** формы, напрамкі навукова-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк па краязнаўству;

ведаць краязнаўчы аспект матэрыяльна-тэхнічнай базы дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству;

ведаць краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства;

валодаць навыкамі фарміравання і выкарыстання фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэк;

валодаць навыкамі падрыхтоўкі краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў, рэсурсаў;

умець рэалізоўваць усе **віды б**ібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству;

умець рэалізоўваць навукова-метадычную і навукова-даследчую дзейнасць бібліятэкі па краязнаўству**.**

У змест вучэбнай праграмы ўключаны матэрыялы для аўдыторнай работы з прымяненнем актыўных форм навучання і заданні для самастойнай работы.

*Кантроль самастойнай работы слухачоў* ажыццяўляецца падчас вучэбных заняткаў і бягучай атэстацыі. Пытанні і заданні для самастойнай работы ўключаны ў матэрыялы для бягучай атэстацыі.

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

Раздзел 1 Асновы тэорыі і арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі

**Тэма 1.1 Краязнаўства як грамадская з'ява** (4 гадзіны, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – самастойная работа)

Краязнаўства як грамадская з'ява: змест, формы арганізацыі, задачы. Тэарэтычныя пытанні краязнаўства. Рэгіёны Беларусі як аб'екты вывучэння краязнаўства. Турыстка-экскурсійны патэнцыял рэгіёнаў Беларусі. Крыніцы краязнаўства. Суб'екты краязнаўства. Асноўныя этапы развіцця краязнаўства Беларусі.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: паняцце, мэта, задачы.

**Тэма 1.2 Асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству** (4 гадзіны, у тым ліку: 2 гадзіны – круглы стол, 2 гадзіны – самастойная работа)

Тэарэтычныя праблемы вызначэння асноўных паняцяў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Суадносіны паняццяў "беларусазнаўства" і "краязнаўства". Вызначэнне паняццяў "край", "рэгіён", "краязнаўчы дакумент", "мясцовы дакумент", "дзеячы і ураджэнцы рэгіёна", "рэгіянальны дакумент", "электронны краязнаўчы дакумент", "змястоўная краязнаўчая экстэрыёрыка", "аўтарская краязнаўчая эктэрыёрыка", "інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства", "краязнаўчая бібліяграфія", "рэгіянальная бібліяграфія".

Інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна: структура, спецыфіка. Рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці (РІП): вызначэнне паняцця, структура. Фактары, якія ўплываюць на фарміраванне РІП. Профіль інфармацыйных патрэбнасцей рэгіёна. Сацыяльна-эканамічны профіль рэгіёна. Інфармацыйная інфраструктура рэгіёна. Інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў па краязнаўстве. Карыстальнік як суб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі, аб'ект – інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі. Тыпалогія карыстальнікаў краязнаўчых прадуктаў і паслуг бібліятэкі па краязнаўстве. Прафесійныя і непрафесійныя (дасугавыя) патрэбнасці. Асаблівасці патрэбнасцей краязнацаў-даследчыкаў. Вывучэнне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі па краязнаўстве. Дзейнасць мясцовых публічных бібліятэк па кансалідацыі жыхароў краю, у тым ліку людзей з абмежаванымі магчымасцямі па здароў'ю ў выніку рэалізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

Нарматыўнае рэгуляванне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Публічныя абласныя бібліятэкі як рэгіянальныя цэнтры дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэчных сістэм. Дзейнасць спецыяльных бібліятэк па краязнаўстве. Роля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навукова-метадычным забеспячэнні бібліятэчна-

бібліяграфічнага краязнаўства. Кіраванне краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк. Фандрайзінг. Выкарыстанне краўдсорсінга, краудфандінга. Прамоцыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Прафесійнае і сацыяльнае партнёрства бібліятэк. Памежнае супрацоўніцтва.

## Раздзел 2 **Асноўныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк**

Тэма 2.1 **Інфармацыйныя рэсурсы** бібліятэкі па краязнаўству (8 гадзін, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – практычны занятак, 4 гадзіны – самастойная работа)

Спецыфіка фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Вызначэнне паняццяў “краязнаўчы фонд”, “фонд мясцовых дакументаў”, “падфонд краязнаўчых дакументаў”, “адзіны краяўнаўчы фонд” і інш.

Сучасныя тэндэнцыі фарміравання фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў як унікальнай часткі нацыянальнага фонду краіны, асновы фарміравання рэгіянальнага і нацыянальнага бібліяграфічнага рэпертуара. Структура, асаблівасці, уласцівасці краязнаўчага фонду бібліятэкі: тэматычны, тыпалагічны, відавы, храналагічны, моўны склад краязнаўчага фонду. Асноўныя групы дакументаў, якія складаюць краязнаўчы фонд. Работа з неапублікаванымі і музейнымі прадметамі. Рэдкія краязнаўчыя і мясцовыя дакументы. Электронны кампанент фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Сеткавыя краязнаўчыя і мясцовыя дакументы. Арганізацыя падфондаў. Электронны краязнаўчы падфонд (архіў). Асаблівасці фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэк розных тыпаў. Сукупны краязнаўчы фонд рэгіёна.

Тэхналагічныя этапы фарміравання краязнаўчага фонду. Мадэліраванне краязнаўчага фонду. Асаблівасці камплектавання краязнаўчага фонду бібліятэкі. Сістэма дакументазабеспячэння фондаў бібліятэк краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі. Краязнаўчая каштоўнасць дакумента як крытэрый яго адбору ўкраязнаўчы фонд. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій пры камплектаванні фонда бібліятэкі.

Фонд мясцовых документаў. Роля мясцовага абавязковага экзэмпляра твораў друку ў фарміраванні фонда мясцовых дакументаў.

**Асаблівасці арганізацыі** фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэкі. **Інтэграваны і дыферэнцыраваны ўлік краязнаўчага фонду. Тэхнічная і навуковая апрацоўка дакументаў краязнаўчага фонду. Асаблівасці размяшчэння, расстаноўкі,** захаванасці **і праверкі краязнаўчага фонду. Сучасныя тэндэнцыі** захаванасці фондаў бібліятэк. **Дэпазітарнае захоўванне краязнаўчых і мясцовых дакументаў.** Кіраванне фондамі краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэкі.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі: паняцце, функцыянальнае прызначэнне, уласцівасці. Структура КДБА, формы існавання яго элементаў. Сістэма краязнаўчых каталогаў, картатэк. Тэхналогія стварэння зводных краязнаўчых каталогаў. Рэгіянальныя зводныя

каталогі бібліятэк Беларусі: сучасны стан і тэндэнцыі развіцця. Спецыфіка адлюстравання краязнаўчых дакументаў у рэгіянальных зводных электронных каталогах бібліятэк Беларусі. Асаблівасці каталогаў мясцовых дакументаў. Зводныя каталогі мясцовых выданняў. Значэнне ўніверсальных фактаграфічных краязнаўчых БД.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ): прызначэнне, камплектаванне, структура, формы. Навігатары па інтэрнэт-рэсурсам краязнаўчага, мясцовага характару.

Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (архіў выкананых даведак): прызначэнне, асаблівасці вядзення ў бібліятэках розных тыпаў. Значэнне і спецыфіка выкарыстання архіваў віртуальных краязнаўчых даведачных служб.

Асаблівасці КДБА ў бібліятэках розных тыпаў. Тэндэнцыі развіцця даведачна-бібліяграфічнага апарату па краязнаўству.

Сучасныя патрабаванні да інфармацыйных прадуктаў бібліятэк па краязнаўству. Асаблівасць краязнаўчых электронных прадуктаў у электронным асяроддзі. Класіфікацыя краязнаўчых электронных прадуктаў. Выкарыстанне карпаратыўнасці пры фарміраванні інфармацыйных прадуктаў. “Кропкі доступу” да інфармацыйных прадуктаў па краязнаўстве. Прыметы фарміравання электронных калекцый па краязнаўстве. Стварэнне інфармацыйных прадуктаў краязнаўчага характару для розных катэгорый карыстальнікаў (дзяцей, моладзі, дарослых; людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя і інш.). Асаблівасці фарміравання баз даных па краязнаўстве, іх рэгістрацыя. Выкарыстанне віртуальных сэрвісаў пры падрыхтоўцы і папулярызацыі інфармацыйных прадуктаў па краязнаўстве.

Спецыфіка асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўцы асобных жанраў рэкамендацыйных (папулярных) і навукова-дапаможных бібліяграфічных дапаможнікаў. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўцы фактаграфічных інфармацыйных прадуктаў Краязнаўчы кантэнт віртуальных прадстаўніцтв бібліятэк: парталы (сайты), сацыяльныя сеткі. Сучасныя тэндэнцыі выдавецкай дзейнасці бібліятэк па краязнаўству. Якасць электронных краязнаўчых прадуктаў.

**Тэма 2.2 Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству** (8 гадзін, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – практычны занятак, 2 гадзіны – дзелавая гульня, 2 гадзіны – самастойная работа)

Сістэма краязнаўчага бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання наведвальнікаў і аддаленых карыстальнікаў, яго спецыфіка. Забеспячэнне бібліятэкамі доступу да інфармацыйных рэсурсаў і паслуг па краязнаўстве. Фактары, якія ўплываюць на ўзровень бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве.

Індывідуальнае бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве. Вызначэнне індывідуальных абанентаў бібліяграфічнага інфармавання, форма прадастаўлення інфармацыі. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве ў традыцыйнай і электроннай формах. Віртуальныя краязнаўчыя даведачныя службы.

Групавое (калектыўнае) бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне краязнаўчага характару. Франтальнае (масавае) бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве.

Асаблівасці і ўзроўні арганізацыі абслугоўвання па краязнаўстве ў публічных і спецыяльных бібліятэках. Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве розных катэгорый карыстальнікаў. Краязнаўчы кампанент фарміравання медыйна-інфармацыйнай пісьменнасці і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў. Выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. Мультыплікацыя як форма прамоцыі кнігі і чытання краязнаўчага зместу.

**Тэма 2.3 Навукова-метадычная і навукова-даследчая дзейнасць бібліятэкі па краязнаўству** (2 гадзіны, самастойная работа)

Арганізацыя навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці па краязнаўстве ў бібліятэках. Нацыянальная бібліятэка Беларусі, абласныя бібліятэкі як навукова-метадычныя і каардынацыйныя цэнтры ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Пошукава-даследчыцкая і метадычная дзейнасць цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. Формы навуковай работы. Напрамкі навуковых даследаванняў. Навуковыя вынікі па краязнаўстве. Узаемадзеянне з іншымі суб’ектамі ў галіне навуковых даследаванняў па краязнаўстве.

Сучасныя практыкі аналітычнай дзейнасці бібліятэк у краязнаўчым накірунку. Кансультацыйна-метадычная дапамога па пытаннях краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных супрацоўнікаў у галіне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у ажыццяўленні навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве.

**Тэма 2.4 Матэрыяльна-тэхнічная база дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству** (2 гадзіны, самастойная работа)

Мясцовая публічная бібліятэка як прадмет бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства і помнік мясцовай гісторыі і культуры.

Архітэктурна-планіровачнае і тэхналагічнае аблічча, інтэр’ер мясцовай публічнай бібліятэкі як сродак краязнаўчага ўздзеяння. Тэхніка-тэхналагічнае аснашчэнне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, укараненне новых тэхналогій.

Напрамкі вывучэння мясцовай публічнай бібліятэкі як матэрыяльнага аб’екта краю і помніка мясцовай гісторыі і культуры ў мэтах стварэння дакументнай інфармацыі аб ёй.

Асноўныя і дадатковыя крыніцы фінансавання краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

**Тэма 2.5 Краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства** (2 гадзіны, самастойная работа)

Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства (бібліятэчнае краязнаўства) як міждысцыплінарны навуковы напрамак, які спалучае бібліятэказнаўчыя, бібліяграфазнаўчыя, кнігазнаўчыя аспекты вывучэння краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Кампанентная структура бібліятэчнага краязнаўства. Цэнтры краязнаўчага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Асноўныя накірункі навуковых даследаванняў. Айчынныя і замежныя даследчыкі ў галіне бібліятэчнага краязнаўства.

## МАТЭРЫЯЛЫ ДА АЎДЫТОРНАЙ РАБОТЫ З ПРЫМЯНЕННЕМ АКТЫЎНЫХ ФОРМ НАВУЧАННЯ

### Круглы стол

**Тэма 1.2 Асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству** (2 гадзіны)

***Сучасны стан тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству.***

*Мэта:* вызначэнне **сучаснага стану тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству.**

*Задачы:*

выявіць, прааналізаваць інфармацыю і вызначыць асаблівасць будынка вывучэння мясцовай публічнай бібліятэкі (месца працы слухача). як матэрыяльнага аб’екта краю і помніка мясцовай гісторыі і культуры;

вызначыць магчымасці архітэктурна-планіровачнага і тэхналагічнага аблічча, інтэр’ера мясцовай публічнай бібліятэкі (месца працы слухача). як сродка краязнаўчага ўздзеяння;

вызначыць асноўныя і дадатковыя крыніцы фінансавання краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі (месца працы слухача).

*Парадак узаемадзеяння*:

1. Адкрыццё круглага стала.
2. Прэзентацыя тэмы, мэты і задач круглага стала.
3. Прэзентацыя пытанняў круглага стала.
4. Абмеркаванне пытанняў круглага стала.
5. Абагульненне вынікаў круглага стала.

*Пытанні для абмеркавання:*

6. Тэарэтычныя праблемы вызначэння асноўных паняццяў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
7. Інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна: структура, спецыфіка.
8. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці.
9. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Беларусі.
10. Прааналізаваць арганізацыю краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі (месца працы слухача).

### Дзелавая гульня

**Тэма 2.2 Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўству** (2 гадзіны)

***Спецыфіка выканання запытаў карыстальнікаў краязнаўчага характару пры даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні.***

Сцэнарый

*Мэта і задача:* фарміраванне ведаў спецыфікі запытаў карыстальнікаў краязнаўчага характару і прафесійных уменняў у слухачоў;

ажыццяўленне выканання запытаў карыстальнікаў краязнаўчага характару пры даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні.

*Працягласць* – 2 акадэмічныя гадзіны.

*Колькасць удзельнікаў* – група з 25–30 слухачоў.

*Парадак правядзення*:

Слухачы дзеляцца па парах, у якіх кожны выконвае ролю "бібліёграфа-краязнаўцы" і "карыстальніка". Вызначыць рэгіён, у адносінах да якога будзе ажыццяўляцца даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне, тэму для кожнага віду запыту, крыніцы пошуку інфармацыі, аформіць даведку.

*Этапы правядзення*:

Уводзіны: прэзентацыя тэмы, мэты і задання.

Асноўная частка:

стварэнне спрыяльнай атмасферы для дыялогу;

падбор заданняў: вызначэнне рэгіёнаў, тэм; тэхналогіі выканання розных відаў запытаў; крыніц пошуку інфармацы; пытанні слухачоў для ўдакладнення; аналіз атрыманых даведак.

Заданні:

5. Вызначыць рэгіён, у адносінах да якога будзе ажыццяўляцца даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне.

6. Слухачу-"карыстальніку" сфармуляваць бібліяграфічныя запыты краязнаўчага зместу розных відаў па пошуку краязнаўчых, мясцовых дакументаў: адрасны, тэматычны, удакладняючы, фактаграфічны з магчымасцю прадастаўлення першакрыніцы.

7. Слухачу-"бібліёграфу-краязнаўцу" выканаць даныя запыты па краязнаўству з выкарыстаннем электронных інфармацыйных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: электронны каталог, зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі, рэгіянальны зводны каталог бібліятэк пэўнай вобласці Беларусі, нацыянальная бібліяграфія Беларусі, "Нацыянальная база даных аўтарытэтных/ нарматыўных запісаў", БД "Беларусь: ад мінулага да сучаснага", БД "Беларусь у асобах і падзеях", ліцэнзійныя базы даных Віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (па-магчымасці), іншых крыніц інфармацыі.

8. Вынікі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання занесці ў табліцу.

| Запыт | Удакладненне запыту (пры неабходнасці) | Даведка (БА дакументаў) | Крыніцы пошуку інфармацыі | Пуць пошуку |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

*Заключная частка*: абагульненне і падвядзенне вынікаў.

МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Раздзел 1 Асновы тэорыі і арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі

**Тэма 1.1 Краязнаўства як грамадская з’ява**

*Заданне* (2 гадзіны)

Падрыхтаваць адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

6. Краязнаўства як грамадская з’ява: змест, формы арганізацыі, задачы, тэарэтычныя пытанні.
7. Рэгіёны Беларусі як аб’екты вывучэння краязнаўства.
8. Асноўныя этапы развіцця краязнаўства Беларусі.
9. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: паняцце, мэта, задачы.
10. Узнікненне і развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства Беларусі.

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [3, с. 7–15; 26, с. 581–585].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 1–4).

**Тэма 1.2 Асновы тэорыі і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі па краязнаўству**

*Заданне* (2 гадзіны)

Падрыхтаваць адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

8. Тэарэтычныя праблемы вызначэння асноўных паняцяў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
9. Інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна: структура, спецыфіка.
10. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі, іх інфармацыйныя патрэбнасці.
11. Нарматыўнае рэгуляванне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Беларусі. Кіраванне краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк.
12. Назавіце формы, якія выкарыстоўваюцца Вашай бібліятэкай (месца працы слухача) для вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі па краязнаўству.
13. Вызначыць сацыяльна-эканамічны профіль рэгіёна (для бібліятэкі–месца працы слухача).
14. Назавіце катэгорыі карыстальнікаў інфармацыі па краязнаўству Вашай бібліятэкі (месца працы слухача).

*Літаратура для самастойнага вывучэння:* [26, с. 590–598; 27, с. 8–19; 28, с. 20–23; 29; 31].

*Патрабаванні да праверкі вынікаў самастойнай работы.* Праверка вынікаў самастойнай работы ажыццяўляецца пры правядзенні бягучай атэстацыі (пытанні № 4–6).

Раздзел 2 **Асноўныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк**

**Тэма 2.1 Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўству**

*Заданне 1* (2 гадзіны)

Знайсці адказы з выкарыстаннем рэкамендуемай літаратуры на наступныя пытанні:

7. Спецыфіка фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў.
8. Асаблівасці арганізацыі фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў бібліятэкі.
9. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі.
10. Краязнаўчыя электронныя прадукты: асаблівасць, класіфікацыя, якасць.
11. Спецыфіка асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўцы краязнаўчых прадуктаў.

*Заданне 1* (2 гадзіны)

Прайдзіце тэст для самаправеркі:

**1.** Краязнаўчы фонд, гэта – ______________________________________

5. Распалажыце ў парадку супадчынення наступныя тэрміны:

**24.1.** Адзіны (сукупны) краязнаўчы фонд краіны

**24.2.** Фонд краязнаўчых дакументаў

**24.3.** Падфонд краязнаўчых дакументаў

**24.4.** Сукупны краязнаўчы фонд края

**25.** Адзначце правільны адказ:

Асноўнай характарыстыкай краязнаўчага фонда з’яўляецца:

**25.1.** Велічыня

**25.2.** Паўната

**25.3.** Аб’ём

**26.** Дапоўніце сказ:

Краязнаўчыя дакументы захоўваюцца ў фондзе незалежна ад года выдання і _____________ спісанню як састарэлыя па зместу.

**27.** Адзначце правільны адказ:

Спецыфіка фарміравання краязнаўчых фондаў залежыць ад:

**27.1.** саставу кантынгента карыстальнікаў і іх інфармацыйных патрэбнасцей

**27.2.** сацыяльна-эканамічнага і культурнага профілю рэгіёна

**27.3.** камплектатара

**27.4.** іншае________

**28.** “Інфармацыйныя патрэбы рэгіёна” і “рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбы”: якое паняцце шырэйшае?

**29.** Назавіце метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў____________________________________________________

**30.** Назавіце фактары, якія вызначаюць профіль інфармацыйных патрэбнасцей рэгіёна_________________________________________________

**31.** Дапоўніце сказ:

Дэпазітарыямі краязнаўчых і мясцовых дакументаў з'яўляюцца ______________ бібліятэкі.

**32.** Адзначце правільны адказ:

Найбольш шырокія па складу і глыбокія па паўнаце краязнаўчыя фонды збіраюцца ў:

**32.1.** публічных масавых бібліятэках ;

**32.2.** абласных бібліятэках;

**32.3.** спецыяльных бібліятэках.

